„Ні аднаго цэнтнэра прыватніку“

ГНАЦЬ УВЕРХ КРЫВУЮ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 265 (4170)
АЎТОРАК 29 верасьня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

Сацспаборніцтва, ударніцтва, узаемадапамога калгасаў, саўгасаў і МТС—зарука посьпеху барацьбы за хлеб

Ангельскі крызіс

Крызіс ангельскай валюты ня проста фінансавы крызіс, ня толькі крызіс капіталістычнай і імпэрыялістычнай Англіі. КРЫЗІС АНГЕЛЬСКАЙ ВАЛЮТЫ — новая, найбольш глыбокая ФАЗА СУСЬВЕТНАГА ЭКАНАМІЧНАГА КРЫЗІСУ.

Крэдытна-грашовы і валютны крызіс АНГЛІІ хутчэй, чым крызіс прамысловы і аграрны, пашырыцца на ўсе краіны капіталу, выклікаючы ў адных — паглыбленьне эканамічнага крызісу, імпліва паскараючы ў іншых ПЕРАРАСТАНЬНЕ ЭКАНАМІЧНАГА КРЫЗІСУ Ў ФІНАНСАВЫ.

Але калі фактычнае банкрутства Англіі будзе нямінуча мець вялізарнейшы ўплыў на эканамічнае становішча ва ўсім капіталістычным сьвеце, дык у сваю чаргу, сам ангельскі крызіс вырас на глебе агульна-сусьветнага крызісу.

Можна прадставіць Макдональдам, Сноўдэнам і Балдуінам гаварыць аб «добраахвотным», «сьвядома прынятым» нацыянальным урадам Англіі рашэньні адмовіцца ад залатога стандарту. Можна прадставіць ім цешыцца тым, што паданьне валюты «выратуе» ангельскую прамысловасьць і гандаль.

Але каб пераканацца ў глыбокай крывадушнасьці падобных заяў, у самаўцяшэньні, даволі ўспомніць, як зусім яшчэ нядаўна ацэньвалі тыя-ж палітычныя дзеячы, і не яны адны, МАГЧЫМЫ КРАХ ФУНТА СТЭРЛІНГАЎ. «Надыходзячая навальніца», «вялізарнейшае няшчасьце для нас і для ўсяго сьвету», «КАТАСТРОФА», «СУСЬВЕТНЫ РАЗГРОМ» — вось словы Макдональда, Балдуіна і іншых напярэдадні «добраахвотнага» скасаваньня залатога стандарту, быццам «у інтарэсах ангельскага гандлю і прамысловасьці».

Трэба прызнаць, што гэтыя ацэнкі тым бліжэй да ісьціны, што сучасныя спробы прадставіць фінансавы крызіс Англіі, як сьвядома праводзімую фінансавую рэформу ў мэтах аздараўленьня ангельскай эканомікі.

Перш за ўсё, ці мог ангельскі ўрад НЯ ПРЫНЯЦЬ свайго гістарычнага рашэньня?

НЕ, НЯ МОГ. Ангельская валюта ўжо на працягу многіх месяцаў падтрымлівалася на ўзроўні залатога парытэту зусім штучным чынам — шляхам ВЫВАЗУ ЗОЛАТА (на 200 млн. фунтаў за 5-6 месяцаў).

Каштоўнасьць тэй ці іншай валюты цалкам акрэсьліваецца складанымі ўмовамі попыту і посулу. Між тым, па меры скарачэньня актыўнага САЛЬДО-РАЗРАХУНКОВАГА БАЛЯНСУ Англіі, натуральна скарачаўся і ПОПЫТ на ангельскую валюту. Што-ж датычыць разрахунковага балянсу, дык яго няўхільнае пагоршаньне на працягу апошніх гадоў — гадоў сусьветнага эканамічнага крызісу — было выклікана катастрафічным ЗЬНІЖЭНЬНЕМ ангельскага экспарту пры роўнапежным СКАРАЧЭНЬНІ так званага нябачнага экспарту, г. зн. даходаў з-за мяжы ад фрахтаў, замежных капіталаўкладаньняў, рознага роду камісійных (зьвязаных з тым, што фунт стэрлінгаў зьяўляўся сусьветнай разрахунковай адзінкай), турызму і інш.

Ужо ў 1930 г., г. зн. пасьля таго, як сусьветны эканамічны крызіс ахапіў і ФРАНЦЫЮ — апошні «незаражаны» востраў капіталістычнага сьвету, актыў разрахункова балянсу Англіі рэзка скараціўся (з 504 млн. фунтаў да 431 млн.). Гэта скарачэньне пасьледавала ў выніку вельмі чулага зьніжэньня фрахтаў, г. зн. даходаў ад эксплёатацыі ангельскага гандлёвага флёту, і паступленьняў ад памешчаных за мяжой капіталаў (з 276 млн. фунтаў да 235 млн.).

Зусім відавочна, што тое і другое зьніжэньне адбылося пад непасрэдным уплывам сусьветнага эканамічнага крызісу. Першае — у выніку катастрафічнага паданьня сусьветнага гандлю, і ў прыватнасьці, гандлю Англіі. Другое — у выніку сусьветнага прамысловага і аграрнага крызісу.

Калі ў 1930 г. разрахунковы балянс даў яшчэ СТАНОЎЧАЕ САЛЬДА Ў 39 млн. фунтаў, дык у бягучым годзе ясна намецілася АДМОЎНАЕ сальда.

Асноўная маса ангельскіх капіталаўкладаньняў прыходзіцца НА ДОЛЮ АНГЕЛЬСКІХ ДАМІНІЁНАЎ І КАЛЕНІЙ, краін Паўднёвай Амэрыкі і Нямеччыны. Іле іменна ў гэтых краінах аграрны (у калеініях, Бразыліі і Аргентыне) і прамысловы (у Нямеччыне) крызіс выбухнуў з найбольшай сілай. На працягу ўсяго бягучага году гэты крызіс няўхільна паглыбляўся.

Ня дзіва таму, што даходы ад ангельскіх капіталаў, зьмешчаных у чыгункі, прамысловасьць, гандаль і сельскую гаспадарку ГЭТЫХ КРАІН, КАТАСТРАФІЧНА ПАДАЛІ. Паводле прыблізных падлікаў у 1931 г. даходы па гэтым артыкуле актыву разрахункова балянсу ўпадуць, прыкладна, да 50 млн. фунтаў (за першы квартал яны складалі ўсяго 8 млн. фунтаў супроць 45 млн. у 1929 годзе і 33 млн. у 1930 г.).

У той-жа час замежны гандаль Англіі за першыя восем месяцаў бягучага году даў адмоўнае сальда ў 246 МЛН. фунтаў, што дазваляе чакаць за ўвесь год дэфіцыту, ня гледзячы на скарачэньне агульнага гандлёвага звароту, прынамсі, у суме, якая ня многім уступае, калі ня роўнай, петашняй (г. зн. 392 млн. фунтаў).

Такім чынам, пры захаваньні ў 1931 годзе пасыву разрахункова балянсу на ранейшым, або на амаль ранейшым узроўні, актыў па адным толькі артыкуле (замежныя капіталаўкладаньні) зьнізіўся, прыкладна, на 180 млн. фунтаў. А гэта азначае, што станоўчае сальда мінулага году ў 39 млн. фунтаў у гэтым годзе павінна будзе ператварыцца ў адмоўнае сальда і пры гэтым роўнае 140 млн. фунтаў.

Вось дзе крыніца «ДОБРААХВОТНАГА» рашэньня нацыянальнага ўраду Макдональда аб скасаваньні залатога стандарту ў Англіі. Паколькі Францыя і ПАЗШ АДМОВІЛІСЯ ад далейшага крэдытаваньня Англіі, ёй заставалася адно з двух — або аддаць на пакрыцьцё гэтых 140 млн. фунтаў разрахункова дэфіцыту ўвесь свой залаты запас, які на 1-га студзеня 1931 г. складаў каля 156 млн. фунтаў, або адкрыта прызнаць сваё ДЗЯРЖАЎНАЕ БАНКРУЦТВА, інакш кажучы, шляхам абясцэньваньня фунта скараціць рэальную, выражаную ў золаце, значнасьць свайго разрахункова дэфіцыту.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЎРАД ВЫБРАЎ, І НЯ МОГ ВЫБРАЦЬ ІНШАГА ШЛЯХУ, ШЛЯХ ПРЫКРЫТАГА БАНКРУЦТВА, ШЛЯХ ІНФЛЯЦЫІ.

Ці выратуе інфляцыя ангельскую буржуазію ад вынікаў эканамічнага крызісу?

Зразумела, вопыт інфляцыі ў Нямеччыне і ва Францыі як быццам дазваляў ангельскай буржуазіі спадзявацца, што цаной новага аграбленьня пралетарыяту і ўсіх працоўных, цаной зруйнаваньня дробнай буржуазіі, цаной зьбядненьня сялянства — можна будзе павялічыць ангельскі экспарт і тым выраўняць разрахунковы балянс Англіі.

Аднак, гэтым, надзеям, мусіць, ня суджана ажыцьцёвіцца і вось чаму:

Па першае, і нямецкі і францускі вопыт працякаў у пэрыяд часовай «стабілізацыі» капіталізму, але не ў эпоху жорсткага эканамічнага крызісу. У сучасны момант спробы Англіі фарсаваць з дапамогай ІНФЛЯЦЫЙНАГА ДЭМПІНГУ свой экспарт сустрэнуць самае рашучае процідзеяньне з боку ўсіх імпартуючых краін. У адказ на гэтыя спробы перад ангельскім экспартам вырастаюць непраніцальныя сьцены ў форме ЗАБАРОНЧЫХ МЫТ І ПРОСТЫХ ЗАБАРОН УВОЗУ АСОБНЫХ ТАВАРАЎ.

Па другое, дагэтуль ангельскі экспарт у вялікай ступені актывізаваўся усёй вялізарнай сусьветнай фінансавай сыстэмай Англіі, якая базавалася на тым, што фунт стэрлінгаў у сваёй непахіснасьці прадстаўляў міжнародную разрахунковую адзінку.

Між тым, ужо зараз з усяго сьвету — з Францыі, Галяндыі, Турцыі, Грэцыі, Індыі, Шэйцарыі — паступаюць паведамленьні аб АДМАЎЛЕНЬНІ АД ФУНТА, ЯК РАЗРАХУНКОВАЙ АДЗІНКІ. Дзівіцца таму ня прыходзіцца: у фінансавым і гандлёвым сьвеце пануе суровы дзелавы разрахунак. Са зьбанкрутаваўшым фунтам — хоць-бы ён тройчы называўся ангельскім — гэтаму сьвету няма чаго рабіць.

І, нарэшце, трэцяе.

ІНФЛЯЦЫЯ Ў НЯМЕЧЧЫНЕ ЛЕДЗЬ НЕ ПАСТАВІЛА НЯМЕЦКУЮ БУРЖУАЗІЮ ПАД УДАРЫ ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ. ІНФЛЯЦЫЯ Ў АНГЛІІ — у эпоху сусьветнага эканамічнага крызісу, калі пік беспрацоўных у Англіі дасягнуў амаль 3 млн. чал., у пэрыяд надзвычайнага напружаньня клясавай барацьбы, ствараючай у асобных краінах рэвалюцыйную сытуацыю, — інфляцыя ў Англіі, якая азначае новае нячуванае аграбленьне працоўных мас, — інфляцыя ў Англіі, дзе адбываюцца сур'ёзныя хваляваньні сярод маракоў ваеннага флёту, — ГЭТА ІНФЛЯЦЫЯ НЯ ТОЛЬКІ НЯ ВЫРАТУЕ АНГЕЛЬСКІХ КАПІТАЛІСТАЎ, АЛЕ ПАСТАВІЦЬ ІХ ПЕРАД ПАГРОЗАЙ МАГУТНАГА РОСТУ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА РУХУ Ў МЭТРАПОЛІІ, ДАМІНІЁНАХ І КАЛЕНІЯХ.

Няхай Макдональды, Сноўдэны і Балдуіны цешаць сябе... Гісторыя і на гэты раз апраўдае ня іх «аптымістычныя» надзеі, а суровы прагноз камуністаў. АБ ГЭТЫМ — ПАД КІРАЎНІЦТВАМ СВАЁЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ — ПАКЛАПОЦЦЦА АНГЕЛЬСКІЯ РАБОЧЫЯ І ПРЫГНЕЧАНЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ ДАМІНІЁНАЎ І КАЛЕНІЙ.

Загатоўка збожжа па БССР на 25 верасьня

(У процантах да гадавога пляну)

Разам па БССР	Калгасы	Ад наасобны сэктар
20,6	19,1	22,3

„НАВОШТА НАМ ЗЬБІРАЦЦА“

СЛУЦАК.

На 20-га верасьня ШЫШЧЫЦКІ сельсавет выканаў па збожжазагатоўках усяго 0,7 проц. гадавога пляну, Грэскі — 11,6 проц.

Сельсаветы пітаральна бязьдзейнічаюць. Пытаньне аб збожжазагатоўках нават не абгаварвалася на пленумах сельсаветаў. Вясковы актыў ня ўцягнуты ў работу, ня было ніводнай нарады актыву: камісіі садзейнасьці сьпяць.

Уліку паступленьня збожжа па сэктарох няма. Тое самае і з упікам выкананьня цьвёрдых заданьняў.

Партыйныя ячэйкі абодвух сельсаветаў не аддаюць ніякай увагі збожжазагатоўкамі не мабілізуюць грамадзкасьці вакол гэтай кампаніі. На партсходах гэта пытаньне зусім не абгаварвалася. І ня дзіва: сакратар шышчыцкай парт'ячэйкі тав. ШОСТАК, да апошняга часу, нават ня ведае, што ён зьяўляецца сакратаром ячэйкі, а сакратар грэскай парт'ячэйкі тав. Катлінская, наогул пічыць не абавязковымі агульныя партсходы. Яна кажа.

— Навошта нам зьбірацца, мы ўсё амаль штодзённа бачымся і добра ведаем аб усіх справах і бяз сходаў.

Трэба адзначыць, што ў шышчыцкіх і грэскіх работнікаў укараніліся прывычка спадзявацца на дапамогу зьверху, а самім нічога не рабіць.

Слуцкі РК КП(б)Б і РВК павінны зацікавіцца работай гэтых сельсаветаў і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у зрыве збожжазагатовак.

Брыгадзір «Зьвязды» П. Н.

НЯМА НАЦІСКУ НА КУЛАКА

РАГАЧОЎ.

Збожжазагатоўкі па РАГАЧОЎСКІМ раёне праходзяць нездавальняюча. На 20 верасьня гадавы плян выканан толькі на 25 проц. Райвыканком і сельсаветы не націскаюць на кулацка-заможныя элемэнты, не прымушаюць іх здаць збожжа па цьвёрдых заданьнях.

Па СЬВЯЦКІМ сельсавеце цьвёрдыя заданьні даны 51 гаспадарцы, але яны вельмі марудна здаюць збожжа. Сельсавет ня прыцягвае да адказнасьці кулакоў, якія злосна сабатуюць загатоўкі.

Я. С—кі.

БАРЫСАЎШЧЫНА--У АБОЗЕ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

БАРЫСАЎ. (НАШ КАР.).

НА 23-ГА ВЕРАСЬНЯ ГАДАВЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ПА БАРЫСАЎСКІМ РАЁНЕ ВЫКАНАН УСЯГО НА 11,4 ПРОЦ., А ПА РАДЗЕ СЕЛЬСАВЕТАЎ ПРОЦАНТ ВЫКАНАНЬНЯ ЯШЧЭ НІЖЭЙШЫ. ТАК, ГЛІВІНСКІ, ЧАРНЯВІЦКІ, ЗАБАШЭЎСКІ І ВЯЛЯЦКІ СЕЛЬСАВЕТЫ ЗАГАТОВІЛІ ЎСЯГО 2 ПРОЦ. СВАІХ ЗАДАНЬНЯЎ.

ПАРТ'ЯЧЭЙКІ НА МЯСЦОХ У БОЛЬШАСЬЦІ НЕ МАБІЛІЗАВАЛІ МАСЫ НА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК.

У РАЁНЕ НАЛІЧВАЕЦЦА 160 КАЛГАСАЎ І АМАЛЬ УСЕ ЯНЫ ЯШЧЭ НЯ ЎКЛЮЧЫЛІСЯ Ў ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ ПА-ЎДАРНАМУ. МНОГІЯ КАЛГАСЫ ДАГЭТУЛЬ ЯШЧЭ НЕ ЗДАЛІ НІВОДНАГА ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА.

ДА 1-ГА КАСТРЫЧНІКА ПАВІННА БЫЦЬ ВЫКАНАНА 50 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ; ЦЬВЁРДЫЯ ЗАДАНЬНІ ДА ГЭТАГА ТЭРМІНУ ПАВІННЫ БЫЦЬ СПАГНАНЫ ПОЎНАСЬЦЮ. АЛЕ-Ж СЁНЕШНІЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ ЗАГАТОЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ СТВАРАЮЦЬ РЭАЛЬНУЮ ПАГРОЗУ, ШТО ПЛЯН ДА ЎСТАНОЎЛЕНАГА ТЭРМІНУ НЯ БУДЗЕ ВЫКАНАН.

ВЫЛУЧАНЫЯ ПА СЕЛЬСАВЕТАХ СЕЛЬСКІЯ ЎПАЎНАВАЖАНЬНЯ ПА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЮЦЬ, А Ў ЗАБАШОЎСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ ЎПАЎНАВАЖАНЫ ЗАМЕСТ ТАГО, КАБ ПА-БАЯВОМУ ЎЗЯЦЦА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ, ІМКНЕЦЦА ДАКАЗАЦЬ... НЕРЭАЛЬНАСЬЦЬ АПОШНЯГА.

БАРЫСАЎШЧЫНА ПАВІННА ЗДАЦЬ 1.300 ТОН ЗБОЖЖА. ГЭТЫ ПЛЯН ЗУСІМ РЭАЛЬНЫ І МОЖА БЫЦЬ ПОЎНАСЬЦЮ І Ў ТЭРМІН ВЫКАНАН. ТРЭБА ТОЛЬКІ АД САМАЦЁКУ ПЕРАЙСЬЦІ ДА САПРАЎДНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК. ГЭТА—ЗАРАЗ БАЯВАЯ ЗАДАЧА ЎСІХ РАЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

БАРЫСАЎСКІ

Толькі 14,2 проц. пляну

РАГАЧОЎ. (Наш кар.).

Збожжазагатоўкі па раёне праходзяць зусім нездавальняючымі тэмпамі. Толькі бязьдзейнасьцю раду сельсаветаў і партыйных ячэек можна вытлумачыць той факт, што гадавы плян на 20-га верасьня выканан толькі на 14.2 проц. Кампанія збожжазагатовак ня ўвязваецца з правядзеньнем іншых гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы.

У радзе сельсаветаў плян збожжазагатовак выканан менш чым на 10 проц. Так Азеранскі сельсавет загатовіў 5 проц., Курганаўскі—5,4 проц., Збароўскі —7 проц. і г. д.

У той-жа час Даўскі і Пабалаўскі сельсаветы, якія правялі масава-растлумачальную работу і па-базовому ўключыліся ў збожжазагатоўкі, выканалі гадавы плян, першы на 40 проц., другі—на 50 проц.

РК КП(б)Б рашуча ўдарыў па самацёчных настроях у Збароўскім, Азеранскім і Рыскаўскім сельсаветах. Для ліквідацыі прарыву мабілізавана 50 чал. адказных раённых работнікаў, якія накіраваны ў сельсаветы.

І. САЛАДУХІН.

Аб мерапрыемствах па паляпшэньні становішча грамадзкага харчаваньня

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б і СНК БССР

ЦК КП(б)Б і СНК БССР адзначаюць, што рад пастаноў ЦК аб грамадзкім харчаваньні выконваюцца дрэнна, пераломну ў паляпшэньні грамадзкага харчаваньня няма, асабліва ў якасьці. Становішча яго не здавальняе росту запатрабаваньняў рабочых мас. Такое становішча тлумачыцца, як дрэннае працай органаў каапэрацыі і Наркамснабу на гэтым участку, а таксама слабай увагай з боку партыйных, савецкіх, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый.

Назіраецца антысанітарнае становішча сталовых, перагрузка, безгаспадарчасьць, безадказнасьць, адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, абязьлічка ў арганізацыі працы, стратнасьць сталовых і дрэннае нядбайнае абслугоўваньне спажыўцоў.

У мэтах карэннага паляпшэньня грамадзкага харчаваньня, выходзячы з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 19/VIII, ЦК КП(б)Б і СНК БССР пастанаўляюць:

I. Па паляпшэньні працы існуючых прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня

1.

Абавязаць Наркамснаб поўнасьцю забясьпечыць фондамі зацьверджаныя пляны на грамадзкім харчаваньні ў адпаведным асартымэнце з тым, каб арганізацыі грамадзкага харчаваньня маглі цалкам скарыстаць іх для сваіх патрэб. Вылучаныя фонды перадаваць па дагаварох непасрэдна Белкаапхарчу, Белкаапсаюзу і Наркамснабу, апрача ўстаноўленых цэнтралізаваных фондаў — выдзеліць мясцовыя фонды для павялічэньня забесьпячэньня грамадзкага харчаваньня. Даручыць Белкаапсаюзу і Наркамснабу на працягу пяцідзённага тэрміну ўстанавіць парадак і раёны заготовак для патрэб грамадзкага харчаваньня, прадаставіўшы права заключэньня дагавораў паасобных сталовак у мэтах найбольшага розгортваньня мясцовай ініцыятывы.

2.

Абавязаць Белкаапхарч у дзесяцідзённы тэрмін распрацаваць плян арганізацыі пры ўсіх сталовых сьвіноадкормачных, птушнікіх і трусагадоўчых пунктаў, скарыстоўваючы прадукцыю адкорму выключна для патрэб сталовых.

У зьмену ранейшай пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР устанавіць, што ўся прадукцыя адкорму па грамадзкім харчаваньні павінна цалкам ісьці для патрэб грамадзкага харчаваньня.

3.

Катэгарычна забараніць якое-б там ні было памяншэньне норм харчаваньня за лік павялічэньня колькасьці асоб, якія сталуюцца, устанавіўшы, што ўсякае павялічэньне колькасьці асоб, што сталуюцца, якое выходзіць за межы цэнтралізаваных фондаў, павінна праводзіцца за кошт вышчаньня дадатковых мясцовых рэсурсаў.

4.

Даручыць Белкаапсаюзу па сэкцыі грамадзкага харчаваньня на працягу дэкады пераглядзець існуючае налажэньне аб правох і абавязках загадчыкаў сталовых, пашырыўшы іх правы ў справе пралёўленьня мясцовай ініцыятывы па забесьпячэньні сталовых, усклаўшы пэрсональную адказнасьць за санітарнае становішча сталовых, санітарную апрацоўку прадуктаў, стараннае мыцьцё іх, беражлівыя адносіны да пасуды і хаваньне прадуктаў — на загадчыкаў сталовых, ажыцьцяўляючы кантроль за правядзеньнем гэтага ў жыцьцё.

5.

Прапанаваць Белкаапхарчу да 15-га верасьня арганізаваць ва ўсіх сталовых бракераж, незалежны адміністрацыйна ад загадчыкаў сталовых і падпарадкаваны непасрэдна сэкцыям каапхарчу, для ўдзелу ў якім прыцягваць асоб, што сталуюцца, і ўсю заводскую грамадзкасьць.

6.

Усклясьці на Белкаапхарч, яго сэкцыі й органы Наркамснабу адказнасьць за дастаўку добраякасных прадуктаў у патрэбным асартымэнту—для забесьпячэньня сталовых. Абавязаць загадчыкаў сталовых адмаўляцца ад прыёму ня добраякасных прадуктаў для грамадзкага харчаваньня.

7.

Наркамаховы здароўя і Белкаапхарчу арганізаваць на мясцох сыстэматычны кантроль за правядзеньнем у жыцьцё санітарных правіл для сталовых. Наркамюсту БССР даць указаньні сваім органам аб суровым пакараньні вінаватых у антысанітарным становішчы сталовых, чайных, буфэтаў і інш. прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня.

8.

Прапанаваць Белкаапсаюзу — па сэкцыі грамадзкага харчаваньня і ЦП саюзу грамадзкага харчаваньня на працягу верасьня поўнасьцю скончыць перавод усіх сталовых на поўную зьдзельнічыну; у пяцідзённы тэрмін заключыць дагавор з ЦП саюзу аб увядзеньні прагрэсыўнай зьдзельнічыны ня менш, як у 15 буйных сталоўках.

9.

ЦК і СНК лічаць існуючае становішча стратнасьці ў закрытых сталовых недапушчальным і прапануюць Белкаапсаюзу да 15 кастрычніка дасягнуць поўнай рэнтабэльнасьці іх, шляхам устанаўленьня: дасканалай калькуляцыі і адпаведных адпускных цэн, увядзеньня паблюднай сыстэме ў водпуску іх па розных цэнах, а таксама шляхам разгортваньня буфэтнага продажу. Адным з галоўных момантаў у ліквідацыі стратнасьці сталовых павінна зьявіцца правядзеньне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і зьніжэньне выдаткаў.

10.

Ставячы асноўнай і важнейшай задачай усіх каапэрацыйных, партыйных, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый усямернае паляпшэньне існуючых прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня, ЦК і СНК прапануюць Белкаапсаюзу распрацаваць і ўнесьці на зацьвярджэньню Эканам. Савету план далейшага разгортваньня грамадзкага харчаваньня на IV квартал і 1932 г. з тым, каб забясьпечыць найбольш поўны ахоп рабочых і іх сем'яў і, у першую чаргу, прадугледзець у пляне далейшае разгортваньне самадзейных сталовых, сталовых каапэрацыйнага тыпу, буфэтаў, а таксама арганізацыю вырабу розных відаў безалькагольных напіткаў і продаж іх у буфэтах і ларках.

11.

Даручыць гаркомам КП(б)Б прымацаваць з партыйнага актыву тэрмінам па два месяцы, адказных працаўнікоў па два чалавекі да кожнай сталоўкі і іншых прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня для канкрэтнай дапамогі ў справе паляпшэньня становішча гэтых прадпрыемстваў на падставе пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Адначасова прапанаваць гаркомам, райкомам КП(б)Б і РВК заслухваць даклады аб становішчы паасобных сталовых.

II. Матар'яльна-тэхнічная база грамадзкага харчаваньня

13.

Адзначаючы зусім недапушчальныя адносіны гаспадарчых арганізацый да справы грамадзкага харчаваньня, якія прывялі да спыненьня будаўніцтва пераважнай колькасьці пачатых сталовых і павольных тэмпаў будаўніцтва на іншых, ЦК і СНК прапануюць, пад асабістую адказнасьць тав. Амбражуласа, разгарнуць работу па скарачэньні сталовых пры прадпрыемствах: ф-ка «Кастрычнік», «Камунар», «Дрэваапрацоўшчык», раённая сталоўка на Ляхаўцы (Менск), «Дзьвіна», «Чырвоны мэталіст», «Сьцяг індустрыялізацыі» (Віцебск), «Чырвоная Бярэзіна» (Барысаў).

СНК у трохдзённы тэрмін выдзеліць для будаўніцтва гэтых сталовых неабходную колькасьць матар'ялаў, як для па-зачарговага ўдарнага будаўніцтва.

14.

Прапанаваць Белкаапхарчу і яго сэкцыям на мясцох да лістапада месяца правесьці ўвесь бягучы рамонт па ўсіх сталоўках (афарбоўка, пабелка і г. д.) для прывядзеньня іх у належны парадак і санітарнае становішча.

Улічваючы, што рад сталовых па БССР маюць вострую патрэбу ў капітальным рамонце і пабудове дапаможных памяшканьняў, прапанаваць Белкаапхарчу і яго сэкцыям неадкладна прыступіць да правядзеньня рамонту з разьлікам сканчэньня яго не пазьней 1-га сьнежня г. г. Даручыць Дзяржпляну выдзеліць для рамонту сталовых неабходную колькасьць будаўнічых матар'ялаў.

15.

Прапанаваць ВСНГ, Наркамснабу БССР даць заводакіраўніцтвам канкрэтнае ўказаньне аб выкананьні пункту 7 пастановы ЦК УсеКП(б) аб абавязках заводакіраўніцтва ў прадастаўленьні годных і адпаведных памяшканьняў для сталовых і буфэтаў і ў выпадку неабходнасьці — іх рамонту.

16.

Абавязаць Белдаяржбуд, пад адказнасьць тав. Васэрмана, да 1-га студзеня скончыць будаўніцтва фабрыкі-кухні. Даручыць Дзяржпляну ў трохдзённы тэрмін выдзеліць усе неабходныя будаўнічыя матар'ялы, згодна паданай заяўкі.

17.

Улічваючы вялікі недахват абсталяваньня на грамадзкім харчаваньні, абавязаць ВСНГ БССР у дэкадны тэрмін унесьці свае прапановы ў Эканам. Савет аб пакрыцьці недахвату гэтага абсталяваньня шляхам пашырэньня і арганізацыі вырабу яго як на заводах Белмэталяабʼяднаньня, так і па саматужнай каапэрацыі, а таксама падрыхтаваць поўнае пакрыцьцё патрэбы ў абсталяваньні па грамадзкім харчаваньні на 1932 г.

18.

Даручыць ВСНГ на працягу 2-хдэкаднага тэрміну распрацаваць плян рэканструкцыі заводу «Чырвоны мэталіст» (Барысаў), спэцыялізаваўшы яго выключна па вырабе абсталяваньня для грамадзкага харчаваньня. Даручыць Дзяржпляну выдзеліць для патрэб грамадзкага харчаваньня з фондаў іншых арганізацый 0,5 тон волава для палудны пасуды.

19.

Прапанаваць Белкаапхарчу распрацаваць плян павышэньня тэхнічнай базы грамадзкага харчаваньня, разгарнуўшы работу па мэханізацыі сталовых, арганізацыі свайго ўласнага транспарту і інш. Пры разьмеркаваньні аўтамашын улічыць запатрабаваньне Белкаапхарчу.

20.

Абавязаць Белкаапхарч шырока разгарнуць работу па мабілізацыі сродкаў (абанімэнтаў), паставіўшы свайм задачай хутчэйшы пераход да адмаўленьня ад банкаўскага крэдытаваньня. Адначасова паставіць перад Усекаапхарчам пытаньне аб здавальненьні сродкамі як для выкананьня бягучых патрэб, так і для забесьпячэньня далейшага разгортваньня грамадзкага харчаваньня.

III. Кадры для грамадзкага харчаваньня

21.

Даручыць Белкаапсаюзу і сэктару кадраў ЦК на працягу дзьвёх дэкад разгледзець плян падрыхтоўкі кадраў па сэкцыі грамадзкага харчаваньня ў бок яго пашырэньня, у мэтах найбольшага забесьпячэньня яго кадрамі.

22.

Прапанаваць Белкаапхарчу забясьпечыць свячасовы пачатак навучальнага году ў школах ФЗВ кулінараў у Віцебску, Магілеве, Гомелі і Менску і тэхнікуме грамадзкага харчаваньня. Усім гаркомам і РК КП(б)Б, камсамолу і прафсаюзам аказаць дапамогу сэкцыям грамадзкага харчаваньня ў пасылцы кандыдатаў у гомельскі тэхнікум грамадзкага харчаваньня, згодна дасланай раскладцы.

23.

Даручыць Белкаапхарчу распрацаваць пытаньне аб арганізацыі пры інстытуце спажыўкаапэрацыі спэцыяльнага аддзяленьня па грамадзкім харчаваньні.

24.

Абавязаць сэктар кадраў ЦК вылучыць 5 адказных працаўнікоў для ўзмацненьня сэкцыі грамадзкага харчаваньня (тэрмін 5 дзён).

Прапанаваць каапэрацыйным, прафэсыянальным і партыйным арганізацыям разгарнуць шырокую масавую работу на прадпрыемствах вакол задач карэннай перабудовы справы грамадзкага харчаваньня на падставе пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, дабіўшыся разгортваньня масавага рабочага кантролю і канкрэтнай дапамогі ў перабудове.

Белкаапхарчу разам з саюзам грамадзкага харчаваньня разгарнуць масавую работу на палітычным выхаваньні рабочых грамадзкага харчаваньня, укараненьні культурных навыкаў абслугоўваньня і мэтаду сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Даручыць органам друку разгарнуць на старонках друку і асабліва ў газэце «Рабочай» кампанію аб ходзе выкананьня пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па грамадзкім харчаваньні.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

Барацьба за лён

У 3-дзенны тэрмін праверыць забясьпечанасьць сушыльна-мяльнымі пунктамі

Арганізаваць ахову ўраджаю ільну і канапель

Скарыстаць кожную мялку і сушню!

Пастанова калегіі НКЗБ

У сувязі з наступленьнем дажджлівага надвор'я, некаторая частка выцераблена ільну стаіць у снопох на полі і псуецца ад дажджу. Затрыманьні з сушкай снопоў ставяць пад пагрозу своячасовую апрацоўку і здачу валакна, а таксама захаваньне якасьці прадукцыі. Пагроза пагыбляецца яшчэ і тым, што ў некаторых раёнах зусім не падрыхтаваны сушыльна-мяльныя пункты.

У мэтах своячасовай і поўнай апрацоўкі ўсяго ўраджаю ільну і канапель да гадавой прадукцыі—валакна, а таксама ў мэтах папярэджаньня страт пры ўборцы і апрацоўцы ўраджаю, Наркамзем пастанаўляе:

Абавязаць райза і райкалгасасоюзы не дапускаць пакіданьня снопоў на полі, на зямлі пры дажджлівым надвор'і, а разьвешваць іх на вешалкі, скарыстаўшы павеці.

Абавязаць загадчыкаў райза і старшынь райкалгасасоюзаў у трохдзённы тэрмін праверыць забясьпечанасьць сушыльна-мяльнымі пунктамі для апрацоўкі ўсяго ўраджаю ільну і канапель.

Скарыстаць усе наяўныя прасьцейшыя сушыльныя памяшканьні (ёўні, лазьні), безадкладна адрамантаваўшы тыя з іх, якія пры праверцы аказуцца непрыгоднымі.

Пры адсутнасьці складаных мялак для арганізацыі сушыльна-мяльных пунктаў, скарыстаць наяўныя ў раёнах трох- і двухвальныя мялкі.

Райза і райкалгасасоюзам неадкладна абсталяваць і прыстасаваць буйныя мяльна - сушыльныя пункты, якія пабудаваны ў мінулым годзе.

Райза і райкалгасасоюзам аб выкананьні гэтага інфармаваць Наркамзем.

Наркамзем БССР
РАЧЫЦКІ.

Усе ільнаводчыя калгасы і МТС Полаччыны ўключыліся ў конкурс

ПОЛАЦАК. (БЕЛТА). Полацкі раён уключыўся ў конкурс на лепшае і хутчэйшае правядзеньне першапачатковай апрацоўкі ільну і канапель. Створан райштаб. У конкурс уключыліся ўсе ільнаводчыя калгасы Ветрынскай і Боркавіцкай МТС. Вызначан прэміяльны фонд у суме 4.000 руб.

За сустрэчныя тэрміны

ТАЛАЧЫН. (Па тэлеграфу). Раён уключыўся ў конкурс на лепшае правядзеньне першапачатковай апрацоўкі і здачы таварнай прадукцыі ільнавалакна і пянькі дзяржаве. Створан апэрацыйны штаб.

Разгорнута работа на ўключэньні ў конкурс ільнаводных калгасаў і сельсаветаў. Высунуты сустрэчныя тэрміны здачы прадукцыі: ільнянога семя і ільнатрасты да 25 кастрычніка, а ільнавалакна — да 20 сьнежня.

Сакратар РК КП(б)Б ТРЫЎСІК.
Старшыня РВК ЛЯВОНЕНКА.

Перадавікам — прэміі

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. Калгас імя Чарвякова 21-га верасьня ўключыўся ва ўсебеларускі конкурс на лепшую апрацоўку ільну і канапель. Для распрацоўкі канкрэтных мерапрыемстваў па конкурсе вылучана спэцыяльная кам

Не зацягваць будаўніцтва гомельскага дрэваапрацоўчага камбінату

МЕНСКІ КАМБІНАТ БУДАБ'ЯДНАЛЬНЯ

недадау краіне дзесяткі мільёнау цаглін

Абязьлічка, адсутнасьць гаспадарчага разрахунку, заняпад працдысцыпліны—прычыны прарыву ў прамфінпляне

Ліквідаваць запазычанасьць новабудоўлям, перавесьці работу цягелень на круглы год

Менскі цагельны камбінат Будаб'яднальня павінен быў даць дзяржаве 45 мільёнаў штук цэглы. Праграма выканана ледзь на 15 проц. На тэхнічнай нарадзе камбінату разам з вытворчым аддзелам выявілася прычына срыву прамфінпляну. Прамова тав. **Сталіна** не знайшла свайго адбітку ў рабоце заводу. Працавалі па-старому — абыяк. Нічога ня было зроблена для аўладаньня тэхнікай і для пераводу агрэгатаў на гаспадарчы разрахунак. Да гэтага трэба яшчэ дадаць безадказнасьць майстроў, тэхнікаў і іншых адказных працаўнікоў за свой участак работы, поўную абязьлічку і заняпад дысцыпліны. Ёсьць выпадкі, калі самі майстры зьяўляюцца на работу ў п'яным выглядзе. Норма выпрацоўкі кожнага рабочага не распрацавана, і адказныя працаўнікі на вытворчасьці, як майстры, дзесятнікі і інш., ня маюць аб ёй ніякага представленьня. Адносіны да сваёй работы недацупчальны. Калі адказнаму майстру пальчыку паказваюць на кучу перамаленай цэглы, ён спакойна адказвае: «Гэта яшчэ мала». Усё гэта стварала спрыяючую глебу не для пачаткаваньня, а для падаражаньня прадукцыі. Завод дагэтуль не перайшоў на зьдзельшчыну, пераважная частка работ праводзіцца надзённа.

На заводзе працуюць студэнты-практыканты, якія атрымліваюць стыпэндыю 50 руб. у месяц, а калі ўлічыць іх працу, дык выпрацоўка іх варта ня больш 23-26 руб.

Прагулы панаюць на вытворчасьці, а калі запытаеце, які-ж процант прагулаў, ніхто не адкажа, бо гэта нікому невядома. У гэтым ніваваты бяспляпавасьць і бяссыстэмнасьць у рабоце. Рабочыя не прымацаваны да поўных працэсаў работы. Іх перакідаюць на працягу дня на некалькі розначасовых працэсаў, што не дае магчымасьці майстром кантраляваць работу і ўлічваць прагулы.

На заводзе з калектывам у 600 рабочых адсутнічала такая простая і звычайная рэч, як гудок. Рабочы можа прыходзіць на працу і адыходзіць, калі ён хоча, а абедаць можа на адну гадзіну, а 5, бо невядома, калі ён прыходзіць і адыходзіць. У выніку нядбайнага складаньня табэляў на зарплату майстрамі, фактычная выдача зарплаты затрымліваецца і цягнецца ледзь ня цэлы тыдзень з-за розных недарэчнасьцяй і непаладкаў. Адному не хапае дня, другому трох, а трэцяму 5 і больш. Назіраецца частая выдача зарплаты не таму рабочаму, якому належыць, бо майстры пішуць рабочых без нумароў і пры наяўнасьці 2 або 3 рабочых пад адным прозьвішчам кантора, зразумела, блытае і выдае грошы не таму, каму трэба. Нядаўна гэты «мэтад» каштаваў аднаму майстру 18 руб. Характэрна, што перад выдачай зарплаты прыходзіцца галоўнаму бухгальтару бегаць па ўсім заводзе і прасіць майстроў, каб яны прадставілі табэлі на зарплату. Вельмі кульгае і гаспадарчая частка. Ёсьць адказны загадчык гаспадаркай, а за кожнай дробязьзю прыходзіцца ехаць спэцыялісту, які атрымлівае 250 руб. пэнсіі. Купілі за 300 рублёў вэнтылятар і яго доўгі час не скарыстоўваюць — не падыходзіць. Хто адказвае за куплю нягоднага вэнтылятара — невядома. Калі старшыня заўкому зварачаецца ў гаспадарчую частку за атрыманьнем мыла для рабочых, яго адсылаюць даведацца: «Ці трэба адпускаць мыла рабочым...». Пры такіх умовах зьдзіўляцца цякучасьці рабочай сілы, зразумела, ня прыходзіцца. Зусім правільна падкрэсьліў адзін з адказных кіраўнікоў заводу: «У зрыве прамфінпляну вінаваты ўсе — ад адміністрацыйна-тэхнічнага складу да прафэсыянальных і партыйных арганізацый заводу». Перад кіраўніцтвам заводу стаіць задача: падрыхтаваць да будучага сэзону і стварыць такія ўмовы, каб можна было ня толькі выканаць прамфінплян 1932 году, але і аддаць дзяржаве запазычанасьць па прамфінпляне 1931 г. У такім сэнсе і выказалася тэхнічная нарада ў аднагалосна прынятай рэзалюцыі.

На нарадзе была заслухана цікавая інфармацыя дырэктара заводу аб пераходзе ў бліжэйшым будучым на круглы год работы. Гэта павінна стварыць пераварот у цагельнай вытворчасьці, якая дагэтуль лічылася выключна сэзоннай. Сырэц ня будзе сушыцца, як дагэтуль, толькі ўлетку пад сонцам, але і ўзімку ў спэцыяльна абсталяваных штучных сушыльнях. Завод будзе тады працаваць ня тры месяцы ў год, а дзевяць. Новае капітальнае мерапрыемства дасьць магчымасьць забясьпечыць капітальнае будаўніцтва неабходнай колькасьцю прадукцыі, ліквідуе цякучасьць рабочай сілы ў цагельнай вытворчасьці і г. д.

Г. ДОРСКІ.

4 мільёны рублёў ляжаць мёртвым капіталам

Лесбел, Белдзяржбуд, Саюзлеспрам пакінулі важнейшае будаўніцтва без праектаў, тэхнічнай сілы і абсталяваньня.—За тры гады на пляцоўцы камбінату ня было ні аднаго адказнага работніка Саюзлесправу.—Якасьць работы дрэнная.—Партыкіраўніцтва слабое.—Сацспаборніцтва адсутнічае

Да суровай адказнасьці зрыўшчыкаў сваячасовага пуску камбінату

Новы гігант — дрэваапрацоўчы камбінат у Новабеліцы (Гомель)—будуецца па апошнім слове тэхнікі. Будаўніцтва яго каштуе каля 6 мільёнаў. На камбінаце будзе працаваць больш 1.500 рабочых. Гэты камбінат, на якім арганізуецца масавая вытворчасьць інвэнтару для калгасаў, будзе адзіным на ўсю БССР і Заходні край. Ён адначасова з гэтым будзе выраблять паркет, мэблю, чым адыграе вялізную ролю ў паляпшэньні камунальнай гаспадаркі.

Але ня гледзячы на выключную важнасьць камбінату, будаўніцтва яго фактычна зрываецца. Будаўніцтва значна адстала. Тэрмін пуску адкладваецца з месяцу на месяц. Няма ніякіх гарантый, што камбінат у гэтым годзе будзе скончан.

Яшчэ ў ліпені, калі сталі даклад камбінату на эканамічным савеце пры СНК БССР, там было адзначана, што пастанова СНК ад 30-31 сакавіка г. г. аб тэрмінах будаўніцтва ня выканана. Савет у пастанове запісаў:

«Будаўніцтва Гомельскага дрэваапрацоўчага камбінату ідзе зусім нездавальняюча. Няма ніякіх гарантый у тым, што камбінат у гэтым годзе будзе скончан. Да гэтага часу няма абсталяваньня, не хапае будматар'ялаў; многа абсталяваньня нават яшчэ не заказана за граніцай, і таму лічыць неабходным на адным З БЛІЖЭЙШЫХ пасяджэньняў Савету Народных Камісараў заслухаць даклад Саюзлесправу аб мерапрыемствах для сканчэньня будаўніцтва».

Пасьля гэтай пастановы прайшло больш двух месяцаў і ніякага зруху няма. Будаўніцтва затрымліваецца з-за адсутнасьці большай часткі абсталяваньня і з-за некамплектнага забясьпячэньня будаўніцтва матар'яламі. Для мэблевага і паркетных цэхаў патрэбна 85 варштатаў. Для электрастанцыі няма некаторых частак турбіны, кабэлю, труб і г. д.

Ход будаўніцтва камбінату трэба прызнаць нездавальняючым. Будаўніцтва, у якое ўжо ўкладзена 4 мільёны, зацягнецца на вельмі доўгі час.

Будаўніцтва вядзе Белдзяржбуд, які яго выканаў ня больш, як на 60 проц. Тэмпы бязмоўна марудныя. Сам кіраўнік работ Белдзяржбуду **Блюмберг** з работай не спраўляецца. Адсутнічае тэхнічнае кіраўніцтва. На ўсім будаўніцтве ёсьць толькі адзін малады інжынэр і некалькі тэхнікаў. Амаль усюды—дрэнная арганізацыя работ, нават кваліфікаваныя рабочыя часта ставяцца падносчыкамі для таго, каб забясьпечыць нармальны ход усёй работы. Кантора Белдзяржбуду зацягвае дастаўку цэглы, часта вызначаную для камбінату цэглу аддае іншым арганізацыям. Завод «Калпраца», ня глядзячы на катэгарычныя гаазды Лесбелу забясьпечыць будаўніцтва неабходным расьцідовачным матар'ялам, упарта затрымлівае выдачу матар'ялаў. Таму часта здараецца, што непрасохшыя дошкі адразу ідуць на будаўніцтва, а ад гэтага атрымліваецца нядобраякаснае будаўніцтва. Самае-ж галоўнае — кіраўніцтва Белдзяржбуду не змагло разгарнуць работу па-новаму, у адпаведнасьці з тымі тэмпамі, якія намечаны плянам будаўніцтва.

Будаўніцтва рабочай сілай не забясьпечана. Да 1 чэрвеня ўсё будаўніцтва было забясьпечана рабочай сілай на 50-55 проц. Зараз гэты процант зменшыўся. Не хапае цесьляроў, каменшчыкаў і іншых кваліфікаваных рабочых.

Дастаўкай рабочай сілы займаўся аддзел кадраў гомдзяржбудканторы, які вёў гэту работу па-старыцы. Новых форм вярбоўкі праз калгасы ён баяўся.

Калі было сарвана забясьпячэньне рабочымі, наём рабочых перадалі начальніку будпункту, які адразу ня змог разгарнуць работу і поўнасьцю забясьпечыць неабходнай колькасьцю рабочых. Толькі ў апошні час кіраўніцтва ўзялося за вярбоўку рабочых, за падрыхтоўку кадраў. Зараз арганізаваны ФЗВ, але ў падрыхтоўцы кваліфікаваных рабочых няма поўнай установкі—да якога часу іх рыхтаваць і колькі, бо магчыма чакаць яких-небудзь змен у тым ці іншым «плянаваньні».

Начальнікам кіраўніцтва пабудовай камбінату зьяўляецца тав. **Хэндогі**, які добра вядзе сваю справу. Ён увесь час рашуча змагаецца за тэрміновае сканчэньне будаўніцтва, за зьнішчэньне тых затрыманьняў, якія часта робяцца з боку цэнтральных устаноў, але ён адзін. Адпаведнай дапамогі па месцы яму няма. Партарганізацыя на камбінаце малая, усяго 30 чалавек. Партыкіраўніцтва слабое, таму партработы на будаўніцтве не адчуваецца. Толькі ў апошні час узяліся перабудоўваць партработу, арганізуюцца тры цэхавыя парт'ячэйкі, чаго раней ня было.

Камсамол таксама не стаіць на вышыні сваіх задач. Камсамольцы не паказваюць ударнай работы, амаль адсутнічае спаборніцтва. І толькі зараз ідуць гутаркі аб пачатку спаборніцтва і ўдарніцтва.

Насьценная газэты няма, яна ўжо два месяцы як ня выходзіць. Рабкораўская работа на будаўніцтве не адчуваецца.

Будаўніцтву камбінату трэба дапамагчы. Сучаснае становішча яго патрабуе вялікай увагі мясцовых і цэнтральных органаў БССР.

П. Каламіец.

За адзін сэзон зьмяніліся 7 начальнікаў

У выніку вакханаліі з праектаваньнем і перапраектаваньнем ГОМЕЛЬСКАГА дрэваапрацоўчага камбінату, пер шапачаткова асыгнаваныя на гэту мэту 35.000 руб. дасягнулі 100.000 руб., а само будаўніцтва так заблыталася ў праектах, што апынулася ў тупіку.

Белдзяржбуд, які пачаў будаўніцтва з вялікай прыткасьцю, потым зышоў на «чарапашыя» тэмпы, ня глядзячы на тое, што 1930 год зьяўляўся для будаўніцтва самым спрыяючым у сэнсе забесьпячэньня матар'ялямі, рабсілай і інш. Белдзяржбуд умудрыўся перамяніць за сэзон 1930 году СЕМ НАЧАЛЬНІКАЎ РАБОТ, якія займаліся прыёмкай і перадачай «спраў», зусім не кіравалі будаўніцтвам і давялі да поўнага зрыву будаўнічую праграму 1930 году.

Праспаўшы ўсю зіму, Белдзяржбуд 1-V—1931 году пераводзіць свае будпункты на ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК, не забясьпечыўшы іх ні рабочай сілай, ні матар'ялямі, ні кіраўніцтвам. Такім чынам, і сэзон 1931 году можна лічыць зманьваным. Да жыльлёвага будаўніцтва толькі зараз прыступілі, а па зборачна - малярным цэху ніякай падрыхтоўчай работы не вядзецца.

Саюзлеспрам і Сельмашаб'яднаньне спрачаюцца паміж сабой, хто павінен забясьпечыць будучую вытворчасьць матэрыямі. Перапіска вядзецца больш паў году. Толькі цяпер Сельмаш катэгарычна заявіў, што матэрыямі павінен забясьпечыць Саюзлеспрам.

За тры гады работнікі Лесбелу ня могуць абгрунтаваць сырцовую базу для камбінату. Папярэднія матар'ялы сьведчаць аб тым, што вытворчасьць забясьпечана сырцом на вельмі нязначны тэрмін (прыкладна да 5-ці год).

Усё гэта давяло будаўніцтва да застою і ўкладзеныя да гэтага моманту 4.000.000 руб. ляжаць мёртвым капіталам, а апарат зьядае ня менш 10.000 рублёў у месяц.

Кіраўніцтва ставіла пытаньне аб пабудове перад вышэйшымі органамі (уключаючы і СНК БССР), якія давялі адпаведныя дырэктывы Лесбелу, але лесбелаўцы не зьвярнулі ўвагі. Па дакладу нач. будаўніцтва ў Дзяржпляне БССР аб пагражаючым становішчы на пабудове, была прынята клясычная рэзалюцыя «выклікаць дакладчыка Саюзлеспраму». Між іншым, гэты дакладчык УЖО ДВА МЕСЯЦЫ ЕДЗЕ НА ДАКЛАД.

Мы думаем, што даволі фактаў для таго, каб імі зацікавіліся адпаведныя органы.

КРОЛЬ, САМОЙЛЕНКА, ЗВЕНТАЎ.

ФІБРАЛІТ—НА ЗЬМЕНУ ДЭФІЦЫТНАЙ ЦЭГЛЕ

У Клімавічах арганізуецца камбінат па выпрацоўцы новых будаўнічых матар'ялаў

Дапамагчы камбінату пераключыцца на новую вытворчасьць

Новыя будаўнічыя матар'ялы, як фібраліт, ідаліт, сілікат-арганік адкрываюць шырокія пэрспэктывы для разгортваньня будаўніцтва, асабліва жыльлёвага.

Новыя будматар'ялы па сваёй прастаце і хуткасьці выпрацоўкі даюць магчымасьць зьнішчыць дэфіцыт у некаторых будматар'ялах, асабліва для жыльлёвага будаўніцтва.

Фібраліт выраблецца з адходаў драўніны і звычайных стружак. Гэтыя стружкі злучаюцца з вяжучымі матэрыямі і прасуюцца. Плітка фібраліту амаль не цеплаправодная, а гэта значыць, што дом, пабудаваны з фібраліту, недаступен для холаду.

Фібраліт агнятрывалы. Ён вельмі моцны. Кладка сьцен з фібраліту можа праводзіцца круглы год. І яна ўжо праводзілася пры 1° марозе.

Вельмі вялікая ўвага цяпер аддаецца **сілікат-арганікам**, якія вырабляюцца з запазных матэрый і алікаў. Сілікат-арганікі маюць форму каменьняў і ўладаюць усімі неабходнымі ўласьцівасьцямі — моцнасьцю, агнятрывалаасьцю і г. д. Кладка сьцяны ў 2½ цаглін на халодным растворы каштуе 28 руб. за кв. мэтр. Кладка сьцяны з сілікат-арганікаў таўшчынёю ў 25 сант., гэта значыць таўчэй адной цаглины, каштуе 10 руб. Яна ў тры разы таней цагельнай кладкі. Больш тоўстыя сьцены з сілікат-арганікаў—непатрэбная трата.

Фібраліт па сваіх цэплатэхнічных уласьцівасьцях дазваляе будаваць сьцены ў 14 сант. Кладка сьцяны з фібраліту каштуе 11 руб. за кв. мэтр, т. зн. таксама амаль у 3 разы таней цэглы, але выраб фібраліту ў 10 раз таней цэглы, а пры перавозках фібраліт у 12 раз практычней.

Самым моцным, новым матар'ялам зьяўляецца **ідаліт**. Гэты матар'ял мацней бэтону ў 7-8 раз і наблізкаецца да натуральнай пароды брушчаткі, якою мосьцяць вуліцы.

Трэба адзначыць, што ў Беларусі гэтай важнай справай ніхто ня цікавіцца за выключэньнем Белжылсаюзу, які паставіў, як першачарговую задачу, выпрацоўку новых будматар'ялаў. Згодна пастановы СНК БССР клімавіцкі сілікатны завод перададзены Белжылсаюзу для арганізацыі на ім выробу новых будматар'ялаў. Для рэарганізацыі і складаньня плянаў перабудовы заводу ў Клімавічы прыяжджала з Масквы ці ўсесаюзнага таварыства рацыяналізатараў будаўнічай індустрыі камісія з 6 спэцыялістаў. Камісія, азнаёміўшыся са становішчам заводу, прызнала мэтазгодным рэарганізацыю яго ў камбінат новых будаўнічых матар'ялаў з цэхам стандартных будынкаў. Работа на рэарганізацыі заводу ўжо скончана, гэтымі днямі камісія спэцыялістаў выяжджае ў Клімавічы для разьбіўкі вучасткаў для набудовы новых цэхаў.

Паводле папярэдніх намячэньняў клімавіцкі камбінат будзе выпускаць 150 тыс. кв. мэтр. новых будаўнічых сьцен з матар'ялаў і 60 тыс. тон вапны. Гэтыя матар'ялы будуць выпускацца стандартнымі. Кошт прадукцыі складзе суму ў 10 міл. рублёў. У складзе камбінату спраектаваны таксама завод адкага растварымага шкла з прадукцыяй у 6 млн. руб. Пясок для вадкага шкла знойдзен каля запазных распрацовак заводу. Вучасткі запазных і пясочных распрацовак будуць зьвязаны паміж сабой падвесной аднарэйкавай чыгункай. Праект чыгункі ўжо гатоў. Да зімы мяркуюць яе набудаваць. Праектуецца таксама набудова 2-3-паверховых дамоў для рабочых. Камбінат павінен распачаць сваю работу з 1-га студзеня. Выпрацоўка новых матар'ялаў частково ўжо распачалася.

Камбінат будзе выраблять наступныя матар'ялы—**фібраліт, сілікат-арганікі, сілікапіцыт** і **ідаліт**. Усе гэтыя матар'ялы будзе мець БССР у 1932 годзе.

Работу тармозяць забясьпечваючыя арганізацыі. Клімавіцкі лесправгас ня выконвае дагавору аб водпуску драўніны для стружак, а таксама па недавозцы апалу для заводу. Адсутнічае ліставожалева. Белкаапсаюз ня выконвае пастанову ўраду і Наркамснабу аб забясьпячэньні рабочых заводу прадуктамі і прамтаварамі па сьпісе № 2.

Выпрацоўка новых будматар'ялаў — справа зусім новая і патрабуе дапамогі з боку усёй пралетарскай грамадзкасьці.

Дырэктар клімавіцкага сілікатнага заводу Б. РАЗУЕЎ.

НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

ЯКАСЬЦЬ РАБОТЫ—У ЦЭНТР УВАГІ

З бальшавіцкай напорыстасьцю будзем праводзіць у жыцьцё кожны пункт гістарычнай пастановы ЦК партыі аб школе

Тры тэхнікумы без памяшканьняў

Работа па ўкамплектаваньні архітэктурна-будаўнічага, вячэрняга рабочага і дарожна-будаўнічага тэхнікумаў праведзена здавальняюча. З 710 чал. прыняты ў гэтым годзе ў паказаныя тэхнікумы ў пераважнай большасьці рабочыя з вытворчасьці, а ў вячэрні рабочы тэхнікум, дзе знаходзіцца 1.500 асоб, прыняты выключна рабочыя ад варштату з 10-15 гадовым вытворчым стажам.

Навучальныя пляны таксама складзены і прапрацаваны; падабраны пэдагагічныя сілы.

Раней усе гэтыя тэхнікумы знаходзіліся ў адным трохпавярховым памяшканьні, але, дзякуючы вялікаму новаму набору, старога памяшканьня ўжо не хапае. Для таго, каб распачаць нармальна бягучы навучальны год, неабходна мець 10 новых аўдыторый. Як-жа садзейнічае напышэньню вучэбнай плошчы сэктар кадраў ВСНГ?

Сэктар кадраў і яго кіраўнік т. Валасевіч фармальна падыходзяць да справы, что вядзе да зрыву заняткаў пералічаных тэхнікумаў. Трэцяя частка тэхнікумаўскага памяшканьня, паводле загаду ВСНГ, занята торфінстытутам, ня ўлічваючы, што гэта памяшканьне не здавальняе нават патрэб архітэктурна-будаўнічага і вячэрняга рабочага тэхнікумаў.

Гэтым самым ВСНГ пазбаўляе вучэбнага памяшканьня ня толькі новы прыём у 710 чалавек, але і старэйшыя курсы.

Сэктар кадраў ВСНГ і Галоўдартранс злачынна ўхіляюцца ад вырашэньня гэтага цытаньня, што яшчэ больш ускладняе справу і зацягвае пачатак навучальнага году.

Брыгада студэнтаў тэхнікуму:
Баравік, Шальковіч, Пятухоў, Марголін.

20 камплектаў школ не пачалі заняткаў

У Гарадоцкім раёне пастанова ЦК УсеКП(б) аб школе яшчэ не ператворана ў баявую праграму работы па будаўніцтве сапраўды савецкай палітэхнічнай школы.

Райінспэктар палітычнай асьветы нічога ня робіць па падрыхтоўцы да правядзеньня ліквідацыі непісьменнасьці і малапісьменнасьці.

З-за адсутнасьці настаўнікаў зусім яшчэ не распачыналі работу 20 камплектаў.

Райпаважыўсаюз праяўляе ганебную бязьдзейнасьць у забясьпячэньні школ абуткам вопраткай і гарачым сьнеданьнем.

Е. Ж.

Сшыткі ляжаць на складзе райсаюзу

ДУБРОЎНА. (БЕЛТА). Слабая падрыхтоўка да новага навучальнага году прывяла да зрыву сваячасовага пачатку заняткаў у радзе школ. У 15 школах заняткі зусім яшчэ не распачаты, па раёне не хапае 23 настаўнікаў. Падручнікамі і сшыткамі школы не забясьпечаны ў той час, калі 30 кіп сшыткаў і шмат падручнікаў ужо два тыдні ляжаць на складзе райсаюзу і не рассылаюцца школам. Нярэдкія выпадкі продажу сшыткаў і падручнікаў на прыватны рынак. Яўрэйскія падручнікі, недахват якіх востра адчуваецца, прадаюцца з дадаткам «рускай горкай», як абавязковага асартымэнту.

Рэалізуем адозву ЦК і СНК аб жывёлагадоўлі

ЗМАГАЦЦА ЗА КОЖНАЕ СЬВІНАМЕСЦА

15.000 сьвінамесц замест 135.000 пабудавана ў саўгасах Сьвінаводу

9 СЬВІНАРНІКЎ ЗА 2 ТЫДНІ

Ход будаўніцтва па саўгасах Сьвінавода на сёнешні дзень паказвае аб зусім рэальнай пагрозе невыкананьня гэтай важнейшай задачы.

З 9.943 сьвінарнікаў, паводле пляну, на 15 верасьня **знаходзілася ў працэсе будоўлі 594. ПАБУДАВАНА-Ж І ЗДАНА Ў ЭКСПЛЭАТАЦЫЮ ТОЛЬКІ 117.**

Апошнія 2 тыдні — з 1 па 15 верасьня — ня толькі **НЕ ДАЛІ ПАВЫШЭНЬНЯ ТЭМПАЎ БУДАЎНІЦТВА, А, НААДВАРОТ, ЗЬНІЖЭНЬНЕ.** Калі за жнівень месяц па ўсіх саўгасах Сьвінавода былі пабудаваны **24 сьвінарнікі, дык за 2 тыдні верасьня пабудавана ўсяго** 9 сьвінарнікаў. 401 сьвінарнік у большасьці падведзен пад дах. У 76 сьвінарніках яшчэ ня скончана кладка сьцен.

Па саўгасах Белсаўгастрэсту скончана пабудова толькі 6 абор. З выпачаных 48 абор пачата будаўніцтвам 45. 39 абор скончаны толькі напалову.

Да наступленьня зімніх халадоў засталося ўжо мала часу. Сучасныя тэмпы будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах ні ў якім разе не гарантуюць сваячасовага выкананьня пляну.

Толькі разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва на пабудовах, фарсаваньнем падвозкі круглага лесу і расьпілоўкі яго, змогуць быць падвоены і патроены тэмпы будаўніцтва.

„Вамі кіруе Менск, няхай ён і дапамагае"

У саўгасе «Чырвоны сьцяг» (Мсьціслаўскі раён) стаяць пад адкрытым небам 234 сьвінаматкі, 62 каровы і 96 коняй.

Для будаўніцтва аборы і сьвінарніка не хапае 1.000 кбм. лесаматар'ялаў. Лесбел яшчэ месяц назад павінен быў даць нарад на гэтыя 1.000 кбм. Пакуль што нарадаў няма. На шматлікія просьбы дырэкцыі саўгасу да раённых арганізацый аб аказальні дапамогі, райком КП(б)Б і райвыканком бюракратычна адказваюць:

«Мы вамі ня кіруем. Кіруе Менск, няхай ён і дапамагае».

На гэтым ня спыняюцца раённыя галавацяпы.

Старшыні калгасаў зьнімаюць з работы калгасьнікаў-адыходнікаў. «Той, хто кіне работу, будзе выключан з калгасу»,—залуляе старшыня калгасу **«Савецкая Беларусь»**. Кулацкія ўчынкі старшыні калгасу абурылі ўсіх калгасьнікаў і аднасобнікаў — беднякоў, якія працуюць у саўгасе.

Замест рэагаваньня на такое злачынства, старшыня райкалгассаюзу **Дамброўскі** аўтарытэтна заяўляе: **«Добра зрабілі, калі выключылі з калгасу».**

Для пакрыцьця даху саўгасу неабходна салома. На тэрыторыі сельсавету, у якім знаходзіцца саўгас, ёсьць прыгодная для гэтага салома. Райвыканком замест таго, каб даць разнарадку па гэту салому, адпраўляе яе за дзесяткі кілёмэтраў у Каўціўку (дзе для падсьпілу прыгодна і мятая салома), а саўгасу прапануе ехаць за 20-30 клм. у Пячонкаўскі сельсавет, дзе салома ўся няпрыгодная для стрэх.

Дырэктар саўгасу МАЛЯЎКІН.
Брыгадзір ЦК КП(б)Б ШЫЛЯНКОЎ.

„Зьдзельшчыну на пабудовах цяжка ўвесьці"

ЖЛОБІН. Плян будаўніцтва сьвінарнікаў і абор у раёне пад рэальнай пагрозай зрыву. Паводле пляну ў гэтым годзе трэба было пабудаваць 12 тыповых сьвінарнікаў, распачата-ж будаўніцтва толькі 4. Усё гэта забясьпечвае адпаведнымі памяшканьнямі толькі 1.500 сьвінаматак, або 50% усяго стада.

Ня лепш стаіць справа і а будаўніцтвам абор. З распачатых 12 скончаны толькі 2.

Плян будаўніцтва цялятніку зусім сарваны.

Толькі праваапартуністычнымі адносінамі да вырашэньня праблемы сацыялістычнай жывёлагадоўлі можна тлумачыць такія чарапашныя тэмпы будаўніцтва абор і сьвінарніку.

І сапраўды: кіраўнікі калгасаў **«Чырвоны Кастрычнік»** і **«Чырвоны партызан»** два гады ўжо будуюць сьвінарнікі і нават зараз ня ўпэўнены ў тым, што яны будуць скончаны ў гэтым годзе.

Зьдзельшчына на будаўніцтве злачынна ігнаруецца. Ва ўсіх калгасах, апрача **«Чырвонай рудні»**, **Чырвонай зары»** і **«Чырвонага Кастрычніка»**, такое зьявішча тлумачаць тым, што «зьдзельшчыну на будаўніцтве цяжка ўвесьці». Такая-ж «установка» і тэхніка-будаўніка Пішымскага.

Усялякі спробам ігнараваць пляны будаўніцтва, усялякім апартуністычным хныканьням аб адсутнасьці будматар'ялаў і ігнараванню зьдзельшчыны на будаўніцтве ў дэкадніх аглядзе фэрм трэба пакласьці канец.

Закрэўскі.

На штурм бездарожжа

Засталіся лічаныя дні да канца будаўнічага сэзону на дарогах

ДА 15-га КАСТРЫЧНІКА ПОУНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ДАРОЖНЫХ РАБОТ

Ня гледзячы на тое, што з райкалгассаюзамі заключаны спэцыяльныя дагаворы, рабочая сіла ў многіх раёнах не вярбуецца. Сваю бязьдзейнасьць раённыя арганізацыі тлумачаць дрэнным падвор'ем, асеньняй сяўбой, «прычын» знаходзіцца шмат, але гэта толькі шырмы для прыкрыцьця дрэннай работы.

У Ельскім раёне, паводле заданьня, павінны працаваць штодзенна 1.500 фурманак аднаасобнікаў і 850 калгасных фурманак; фактычна-ж працуе толькі 61 фурманка аднаасобнікаў і 23 калгасныя. У Пухавіцкім раёне патрабуецца для вывазкі каменю 3.000 фурманак, ні адна фурманка на сёнешні дзень не мабілізавана.

Коньны абоз Белдарбуду складаецца з 6.000 коняй, а кадраў фурманаў не хапае. У Ельскім раёне транспарт застаўся без рабочай сілы, за коньмі наглядае... інжынэрна-тэхнічны пэрсанал.

Рад раёнаў маюць некаторыя дасягненьні ў вярбоўцы рабочай сілы і дастаўцы фурманак, але гэтыя дасягненьні не замацаваны. У Шклоўскім і Журавіцкім раёнах вярбоўка рабочай сілы прайшла здавальняюча; вялікі пералом наглядаецца ў рабоце Віцебскага раёну, дзе на работу некалькі раз выходзіла значна большая колькасьць фурманак, чым вызначана заданьнем.

З Украіны павінны штодзенна прыбываць у сярэднім 120-150 вагонаў каменю, а атрымліваецца толькі 30 вагонаў у дзень. Мясцовага каменю з-за малой колькасьці фурманак не хапае.

На работах адчуваецца вялікі недахват кваліфікаванай рабочай сілы. Патрэбны камянёбойцы і шчэбнябойцы, іх не хапае. Паводле пляну, на дарожным будаўніцтве павінна працаваць больш дзесяці тысяч рабочых, працуе 2 тысячы.

Тэмпы работы на дарожным будаўніцтве надзвычай павольныя; брукары забрукоўваюць у дзень ня больш 50 проц. нормы; укачваюцца ня больш паўтара кілёмэтра—каля 25 проц. заданьня.

Вялікую долю віны за дрэнныя тэмпы дарожнага будаўніцтва нясуць прафарганізацыі, якія не разгарнулі культмасавай работы і ўдарніцтва па будаўніцтве. Лепшыя ўдарнікі не прэміюцца, у аплаце працы пануе ўраўнілаўка, няма ўліку ўдарнай работы.

Рабочыя, якія працуюць ля мэханізмаў, зусім нізкай кваліфікацыі. Многія машыны па доўга выведзены са строю з-за няўмелага абыходжаньня з імі. Аднак з прычын псаваньня мэханізмаў—слабая працоўная дысцыпліна па работах. Гэтыя недахопы зьяўляюцца вынікам дрэннай, нявыразнай работы апарату дарожных дыстанцый.

Дрэнна ідзе мабілізацыя камсамольцаў на дарожнае будаўніцтва. Некаторыя раёны мабілізавалі камсамольцаў у дзень МЮД'у. Пасьля дэманстрацыі іх адразу паслалі на работу. Два дні папрацавалі камсамольцы на дарожных работах, а потым уцяклі.

Ёсьць некаторы зрух у забясьпячэньні рабочых дарожнага будаўніцтва. Патрабуе значнага паляпшэньня грамадзкае харчаваньне; не арганізавана спэцыяльнае харчаваньне для рабочых, занятых на кесоных работах.

Белкаапсаюз камандыраваў зараз у рад раёнаў сваіх представнікоў для паляпшэньня справы рабочага забясьпячэньня дарожных рабочых.

Сучаснае становішча дарожнага будаўніцтва патрабуе вельмі выразнай работы кіраўніцтва, праяўленьня максымуму ініцыятывы, пераключэньня ўсіх раённых арганізацый на шырокую дапамогу будаўніцтву дарог. **Баявая задача патрабуе баявых тэмпаў работы.**

Ц.



Мэханізаваныя работы на дарожным будаўніцтве.

Камсамол будуе дарогі

ДУБРОЎНА. (БЕЛТА). Дубровенская камсамольская арганізацыя ўзяла на сябе абавязак пабудаваць 3 клм. шашы. Увесь камсамол мабілізован для правядзеньня гэтага мерапрыемства. Вылучаюцца камсамольскія ўдарныя брыгады для дарожнага будаўніцтва.

Шырэй рацыяналізатарскую работу

Сэктар рацыяналізацыі дарожнага будаўніцтва пры Галоўдартрансе арганізаваўся ў сакавіку г.г. Пры нарабах у чэрвені арганізаваны бюро рацыяналізацыі работ. Аднак, гэтыя бюро не ўкамплектаваны работнікамі. Начальнікі работ мала цікавяцца рацыяналізацыяй дарожнага будаўніцтва.

Нядаўна Галоўдартранс і Белдарбуд камандыравалі работнікаў у Ленабліартранс для азнаямленьня з пастаноўкай рацыяналізатарскай работы. Для кансультацыі запрошан з Ленінграду інжынэр-рацыяналізатар. Праведзена нарада рацыяналізатараў, на якой распрацован рад мер па паляпшэньні рацыяналізатарскай работы.

Рацыяналізатарскія мерапрыемствы значна паляпшаюць якасьць, павялічваюць прадукцыйнасьць працы, павышаюць тэмпы дарожнага будаўніцтва. Так, да рацыяналізацыі брукар рабіў 16,5 кв. мэтраў, пасьля правядзеньня рацыяналізацыі ён забрукоўвае 30 кв. мэтраў. Прадукцыйнасьць катка павялічылася, дзякуючы рацыяналізацыі, з 16 да 27 кбм.

Калі-б былі праведзены ў жыцьцё ўсе рацыяналізатарскія мерапрыемствы, калі-б былі канчаткова ліквідаваны коснасьць і кансэрватызм, якія сустракаюцца сярод інжынэрна-тэхнічных і кіруючых работнікаў, можна было-б зэканоміць на дарожным будаўніцтве мільёны рублёў.

Трэба неадкладна ўзмацніць рацыяналізатарскія органы работнікамі, ажывіць работу вытворчых нарад на дарожным будаўніцтве, уцягнуць масу дарожных рабочых у справу рацыяналізацыі. Адказнейшая задач прыпадае тут на долю прафэсыянальных арганізацый.

ДРАЧОЎ.

2.000 камсамольцаў—на дарожнае будаўніцтва

Пастанова ЦК ЛКСМБ аб мабілізацыі 2.000 камсамольцаў на дарожнае будаўніцтва выконваецца зусім нездавальняюча. Большасьць раённых мапа чаго зрабілі ў гэтым напрамку. З Менскага раёну трэба было паслаць 100 чал. паводле раскладкі, дагэтуль не пасланы ні адзін. Нічога не зрабіў Бялыніцкі райком камсамолу, які мабілізаваў 13 чалавек замест 100.

Па-ўдарнаму выканаў дырэктыву ЦК ЧЭРВЕНЬСКІ райком камсамолу, які мабілізаваў 250 чалавек пры кантрольнай лічбе ў 200.

У Полацкім раёне кожнаму камсамольцу дана заданьне: адпрацаваць тры дні на дарожным будаўніцтве. Шляхам субботнікаў ужо адпрацавана 2.400 працадзён. Бярэзінскі раён пры заданьні ў 100 чалавек мабілізаваў 70, Пухавіцкі выканаў раскладку на 83 проц. Расонскі раён поўнасьцю выканаў кантрольную лічбу.

ЦК ЛКСМБ паслаў у адстаючыя раёны 5 інструктароў для сканчэньня мабілізацыі.

**Большасьць камсамольцаў па-бальшавіцку штурмуюць прарывы ў дарожным будаўніцтве, разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва на дарожных работах. На трэцяй дыстанцыі меў месца выпадак, калі да маб

БССР выканала заданьне па адпраўцы гарнякоў у Данбас

Замест 5.000 паслана на сёнешні дзень 5.015

БАЯВЫМІ ТЭМПАМІ ДА 5-га КАСТРЫЧНІКА СКОНЧЫЦЬ ВЯРБОЎКУ І АДПРАЎКУ БУДАЎНІКОЎ

ЗАДАНЬНЕ ПА АДПРАЎЦЫ БУДАЎНІКОЎ ДЛЯ ДАНБАСУ (4.000 чал.) ВЫКАНАНА УСЯГО НА 51 ПРОЦ. (2 038 чал.)

ЯК ПАВЕДАМІЎ УПАЎНАВАЖАНЫ «УГЛЯ» ТАВ. СОКАЛАЎ, НА 28 ВЕРАСЬНЯ АДПРАЎЛЕНА Ў ДАНБАС 5.015 ГАРНЯКОЎ. ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, ШТО ЗАДАНЬНЕ ПАРТЫІ І ЎРАДУ ПА АДПРАЎЦЫ ДА 1-ГА КАСТРЫЧНІКА Ў ДАНБАС 5.000 ГАРНЯКОЎ ДЛЯ РАБОТЫ Ў КАПАЛЬНЯХ ВЫКАНАНА ДАТЭРМІНОВА. АДНАК, АДПРАЎКА ГАРНЯКОЎ ПРАЦЯГВАЕЦЦА, ШТО ДАСЬЦЬ ЗНАЧНАЕ ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАНЬНЯ.

ГОРШ СТАІЦЬ СПРАВА З ВЯРБОЎКАЙ І АДПРАЎКАЙ БУДАЎНІКОЎ ДЛЯ БУДАЎНІЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ДАНБАСУ. НА 27 ВЕРАСЬНЯ Ў ДАНБАС АДПРАЎЛЕНА 2.038 БУДАЎНІКОЎ ЗАМЕСТ 4.000, ШТО СКЛАДАЕ УСЯГО 51 ПРОЦ.

НАРКАМПРАЦЫ БССР ДЛЯ ПАСКАРЭНЬНЯ ВЯРБОЎКІ БУДАЎНІКОЎ РАЗЬМЕРКАВАЎ ПА 22 РАЁНАХ, ВЫЗНАЧАНЫХ РАНЕЙ ДЛЯ АБ'ЯДНАНЬНЯ «УГОЛЬ», 859 ЧАЛАВЕК, ПА 20-50 ЧАЛ. КОЖНАМУ РАЁНУ.

ГЭТЫМ РАЁНАМ І РАЁНАМ, ПРЫМАЦАВАНЫМ ДА БУДАЎНІЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ДАНБАСУ, ДАН ТЭРМІН ДЛЯ СКАНЧЭНЬНЯ ВЯРБОЎКІ І АДПРАЎКІ БУДАЎНІКОЎ—5 КАСТРЫЧНІКА. ДА ГЭТАГА ТЭРМІНУ ЎСЯ РАБОТА ПА АДПРАЎЦЫ 9.000 РАБОЧЫХ ДЛЯ ДАНБАСУ, ПАВІННА БЫЦЬ ЦАЛКАМ СКОНЧАНА.

АРГАНІЗАЦЫІ ТАКІХ РАЁНАЎ, ЯК ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКАГА, СТАРОБІНСКАГА, БЫХАЎСКАГА, ЯКІЯ НЕ ДАЛІ НІ АДНАГО БУДАЎНІКА ДАНБАСУ, А ТАКСАМА РАЁНЫ, ЯКІЯ ДАЛІ ІХ ВЕЛЬМІ МАЛА (ЛАГОЙСКІ, КОЙДАНАЎСКІ, ПУХАВІЦКІ, СТАРА-ДАРОСКІ, БЯГОМЛЬСКІ, БУДА-КАШАЛЁЎСКІ, ЦЕРАХАЎСКІ, БРАГІНСКІ, КАПЫЛЬСКІ, ПРАПОЙСКІ) ПАВІННЫ РАШУЧА ПАДЦЯГНУЦЦА. ІНАКШ ПРЫДЗЕЦЦА РАБІЦЬ Ў АДНОСІНАХ РАДУ РАБОТНІКАЎ ГЭТЫХ РАЁНАЎ АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ВЫВАДЫ.

ДА 5-ГА КАСТРЫЧНІКА ЗАСТАЛОСЯ 6 ДЗЁН. ГЭТЫЯ ДНІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДНЯМІ ШТУРМУ ПА ВЫКАНАНЬНІ ВАЖНЕЙШАГА ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНАГА ЗАДАНЬНЯ ПАРТЫІ І ЎЛАДЫ.

Шахцёры шахты імя Арцёма.

У Буда-Кашалёўскім раёне абвешчан дэкад нік штурму

На 27 верасьня Буда-Кашалёўскі раён адправіў у Данбас 71 рабочага-будаўніка, замест 240 паводле заданьня. Адбыліся пленумы райкому КП(б)Б і райвыканкому, на якіх адзначана, што ў раёне дагэтуль адсутнічала масава-растлумачальная работа па арганізаваным наборы будаўнікоў для Данбасу. Пленумы, адзначаючы бязьдзейнасьць асобных адказных работнікаў раёну, абвясьцілі дэкаднік штурму па ліквідацыі прарыву ў вярбоўцы будаўнікоў для Данбасу. На правядзеньне штурму пленум прапанаваў 12 чалавек з ліку партыі мабілізаваў 12 чалавек з ліку райпартактыву. Пленум абавязаў усіх сакратароў парт'ячэек безадкладна разгарнуць растлумачальную работу сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў аб палітычным і гаспадарчым значэньні арганізаванага набору рабочых у Данбас. Райкому ЛКСМБ прапанавана забясьпечыць актыўны ўдзел камсамольскіх ячэек у правядзеньні дэкадніка штурму і накіраваць у Данбас ня менш 25 камсамольцаў.

Чырвона-Слабодзкі раён на чорную дошку

Вярбоўка будаўнікоў для Данбасу ў Чырвона-Слабодзкім раёне не разгорнута. Замест 150 чалавек, якіх раён павінен паслаць у Данбас, завербавана ўсяго 8 чалавек і тыя не пасланы. Прадстаўнікі з Данбасу разам з работнікамі раёну чатыры дні аядзелі ў раёне і нічога не рабілі. Зразумела, што так сама робяць і сельсаветы. Старшыня Старчыцкага сельсавету нават ня склікаў сходу для растлумачэньня важнасьці гатай работы. Апартуністычнай бязьдзейнасьці інспэкцыі працы, паасобных сельсаветаў і старшынь калгасаў трэба палажыць канец (БЕЛТА).

АД РЭДАКЦЫІ: КАНСТАТУЮЧЫ АБСАЛЮТНУЮ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ АРГАНІЗАЦЫЙ ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКАГА РАЁНУ Ў СПРАВЕ ВЯРБОЎКІ БУДАЎНІКОЎ ДЛЯ ДАНБАСУ, «ЗЬВЯЗДА» ЗАНОСІЦЬ РАЁН НА ЧОРНУЮ ДОШКУ.

Зводка вярбоўкі будаўніноў на 27 верасьня

РАЁНЫ	Заданьне	Выканана.
1. Чырвонапольскі	250	300
2. Хойніцкі	300	303
3. Плешчаніцкі	160	147
4. Талочынскі	200	171
5. Глускі	320	186
6. Чачэрскі	300	180
7. Сураскі	350	147
8. Веткаўскі	220	99
9. Буда-Кашалёўскі	240	71
10. Капыльскі	250	77
11. Прапойскі	250	67
12. Бягомльскі	150	65
13. Брагінскі	200	55
14. Церахаўскі	240	49
15. Койданаўскі	150	29
16. Старадарожскі	220	29
17. Лагойскі	150	25
18. Пухавіцкі	240	24
19. Быхаўскі	250	0
20. Старобінскі	250	0
21. Чырвона-Слабодзкі	150	0

Раёны, якія, паводле пастановы Наркампрацы, павінны да 5-га кастрычніка паслаць у Данбас 855 будаўнікоў

Лоеўскі	—	20 чал.
Пятрыкоўскі	—	40 »
Бешанковіцкі	—	30 »
Чэрыкаўскі	—	20 »
Клічаўскі	—	40 »
Лёзьнянскі	—	50 »
Бялыніцкі	—	50 »
Бярэзінскі	—	50 »
Горацкі	—	25 »
Жлобінскі	—	40 »
Ельскі	—	50 »
Кармянскі	—	50 »
Касьцюковіцкі	—	50 »
Клімавіцкі	—	50 »
Крупскі	—	50 »
Чаўскі	—	25 »
Рагачоўскі	—	50 »
Рэчыцкі	—	40 »
Уваравіцкі	—	30 »
Чашніцкі	—	30 »
Шклоўскі	—	25 »
Гарадоцкі	—	40 »

На рыштаваньнях Ільназаводаў

МАКСЫМАЛЬНА ФАРСАВАЦЬ ПЕРАКІДКУ ЛЁКАМАБІЛЯЎ І МАНТАЖ АБСТАЛЯВАНЬНЯ

за пабудову ільназаводаў адказваюць у першую чаргу раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі

Пяць ільназаводаў ударнай чаргі, прызначаныя да пуску на 20 верасьня ЯШЧЭ НЯ ПУШЧАНЫ. Мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі, адміністрацыя і рабочыя калектывы пабудоў не зрабілі ўсяго таго, што можна было зрабіць. НІЯКІЯ СПАСЫЛАНЬНІ НА АДСУТНАСЬЦЬ АБСТАЛЯВАНЬНЯ НЯ МОГУЦЬ СЛУЖЫЦЬ «АБ'ЕКТЫЎНАЙ ПРЫЧЫНАЙ» ДЛЯ АПРАЎДАНЬНЯ МАРУДНЫХ ТЭМПАЎ БУДАЎНІЦТВА ЗАВОДАЎ І КАРПУСОЎ. Зусім відавочна, што пры больш правільнай пастаноўцы работы, разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва на пабудове карпусоў і ўсіх заводзкіх памяшканьняў будаўніцтва магло быць скончана ў тэрмін.

«ЗЬВЯЗДА» не адзін раз пісала аб ганебнейшых тэмпах па будаўніцтве ВУШАЦКАГА ІЛЬНАЗАВОДУ. Адкак, СЫГНАЛЫ ДРУКУ НЕ ЎЗВАРУШЫЛІ КІРАЎНІЦТВА ГЭТАГА ІЛЬНАЗАВОДУ. Апошняя дэкада — 10-20 верасьня перад тэрмінам пуску не дала ніякага пералому. На 20 верасьня плян будаўніцтва Вушацкага ільназаводу выканан толькі на 45 проц., пры прыросьце за дэкаду толькі на 3 проц. ХОД БУДАЎНІЦТВА РАДУ ІЛЬНАЗАВОДАЎ УДАРНАЙ ЧАРГІ НІКУДЫ НЯ ВАРТЫ.

Ня лепшае становішча з будаўніцтвам ільназаводаў першай чаргі, тэрмін пуску якіх 1 кастрычніка. На агульным фоне ганебнейшых тэмпаў будаўніцтва асабліва яскрава вызначаецца ВЕТРЫНСКІ ІЛЬНАЗАВОД, плян пабудовы якога выканан толькі на 51 проц. ПА ВЕТРЫНСКІМ І БАГУШЭЎСКІМ ІЛЬНАЗАВОДАХ ЗА АПОШНЮЮ ДЭКАДУ ЗУСІМ НЯМА ПРЫРОСТУ.

У чаканьні, пакуль будуць завезены швінкутрбіны, трансьмісійнае і іншае мантажнае абсталяваньне, кіраўніцтва Белільнаканплябуду своячасова ня ўжы па належных мер, каб забясьпечыць у тэрмін перакідку лёкамабіляў на ільназаводы. Як вынік, на сёнешні дзень ні адзін з ільназаводаў яшчэ не прыступіў да ўстаноўкі лёкамабіляў.

Белторф, які павінен перадаць лёкамабілі для ільназаводаў, да гэтага часу поўнасьцю неабходнай колькасьці лёкамабіляў ня вызначыў. Замест 51 лёкамабіля спачатку быў выдан нарад толькі на 48. А калі прышлося атрымаць лёкамабілі, у радзе месц іх катэгарычна адмаўляліся выдаваць. Выдаўшы 10 верасьня нарад на два лёкамабілі з Бабруйску, праз два тыдні—23 верасьня Белторф АНУЛЯВАЎ ГЭТЫ НАРАД. Такія факты не адзінкавыя.

Чыгуначныя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, начальнікі станцый павінны ўжыць усе меры, каб фарсаваць перавозку па чыгунцы лёкамабіляў, прызначаных для ільназаводаў.

Адміністрацыя і грамадзкасьць торфазаводаў павінна аказаць максымальную садзейнасьць у справе пад'ёму і перакідкі на ільназаводы лёкамабіляў. Ніякімі прычынамі нельга апраўдваць такога становішча, калі адміністрацыя торфазаводу замест дапамогі становіцца ў позу пасыўных бязудзольных наглядальнікаў.

Раённыя камітэты партыі, райвыканкомы і райкалгасаюзы павінны аказаць максымальную садзейнасьць гэтай справе. Між тым, факты, якія ёсьць у нашым распараджэньні, сьведчаць, што па радзе раённаў райвыканкомы, райкалгасаюзы і калгасы не аказваюць належнай дапамогі. Чаго варты адносіны КРЫЧАЎСКАГА і КАСЬЦЮКОВІЦКАГА райвыканкомаў, якія ўпарта не жадаюць аказваць ніякай дапамогі ў пабудове ільназаводаў на тэрыторыі іх-жа раёнаў.

БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ НА БУДАЎНІЦТВЕ ІЛЬНАЗАВОДАЎ ПАВІННЫ ЗЬЯВІЦЦА ПЕРАЛОМНЫМІ Ў БОК САПРАЎДНАЙ ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ У БУДАЎНІЦТВЕ, ПЕРАКІДКІ І ЎСТАНОЎКІ ЛЁКАМАБІЛЯЎ І ФАРСАВАНЬНЯ МАНТАЖНЫХ РАБОТ.

Партыйныя і савецкія арганізацыі павінны шчыльна ўзяцца за справу пабудоў, памятаючы, што будаўніцтва ільназаводаў—справа ўсёй грамадзкасьці.

Забясьпечыць бесьперапынную работу

ШКЛОЎ. Нядаўна ільназавод імя Сталіна ўступіў ў эксплёатацыю. Ён павінен пераапрацаваць у гэтым годзе 8.000 тон ільнасаломы і трасты.

З першых дзён работы высьвятлілася, што швінкутрбіна і агрэгаты ўкамплектаваны старымі дэталямі. Таму ў працы заводу бываюць перабоі.

Адміністрацыйна-тэхнічны персанал і рабочыя не забясьпечаны кватэрамі. Белканапляводбуд не дае сродкаў для пабудовы сталоўкі.

Такое становішча ставіць над пагрозу выкананьне праграмы. Кіраўніцтва павінна стварыць адпаведныя ўмовы, каб забясьпечыць бесьперапынную работу ільназаводу.

ЯН.

ЗВОДКА

аб ходзе будаўніцтва ільназаводаў ударнай і першай чаргі па становішча на 20 верасьня 1931 г.

НАЗВА ЗАВОДУ.	Проц. выкананьня па заводу.	Проц. выкананьня па корпусу.
ЗАВОДЫ ЎДАРНАЙ ЧАРГІ — ТЭРМІН ПУСКУ 20 ВЕРАСЬНЯ		
ВУШАЦКІ	45	62
МЕЖАНСКІ	75	93
КОПЫСКІ	68	86
КРУПСКІ	99	98
ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ	70	81
ЗАВОДЫ ПЕРШАЙ ЧАРГІ, ТЭРМІН ПУСКУ 1 КАСТРЫЧНІКА		
ГАРАДОЦКІ двухтурбінны	58	82
ЛЮБАНЬСКІ	73	92
ВЕТРЫНСКІ	51	87
БАГУШЭЎСКІ	79	76
ГАРАДОЦКІ	66	60
ХОЦІМСКІ	77	86
АГУЛЬНЫ ПРОЦАНТ		
па заводах ударнай чаргі	75,4	85
па заводах першай чаргі	65,[illegible]	81,5

Пачалі першымі, а адсталі ад апошніх

Пабудова Асьвейскага ільназаводу пачалася раней другіх заводаў Віцебскага будаўнічага вучастку Белільканапляпбуду. Здавалася-б што ён павінен адным з першых скончыць пабудову і прыступіць да мантажу.

Аднак, на справе аказалася, што процант выкананьня плянаў будаўніцтва на 15 верасьня наступны: вытворчы корпус—драўляная частка пабудавана на 19 проц., а каменная—на 57 процантаў. У агульным плян будаўніцтва заводу выканан толькі на 38 проц. Такія тэмпы будаўніцтва ствараюць ідуную пагрозу, што ільназавод ня будзе своячасова пабудаваны.

Дырэкцыя заводу ня ўжыла мер, каб забясьпечыць завод рабочай сілай як кваліфікаванай, так і некваліфікаванай. На пабудове працуе толькі 16 зусім малакваліфікаваных цесьляроў-ціпаўцаў. Асьвейскі райвыканком і раённыя арганізацыі ня ўжылі ніякіх мер, каб забясьпечыць завод рабочай сілай.

Адміністрацыя заводу не адпавядае свайму прызначэньню. На пабудове адсутнічае працоўная дысцыпліна, сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута.

Асьвейскі раённы камітэт партыі павінен неадкладна праверыць становішча будаўніцтва ільназаводу і забясьпечыць своячасовы пуск яго.

Л.

Так жадае віцебскі гарсавет

16 верасьня на станцыю Віцебск МББ чыгункі прыбыло два вагоны агнятрывалай цэглы для пабудовы ільназаводаў віцебскага будвучастку. Прыбыўшая цэгла была выкуплена вучасткам, заставалася толькі пераадправіць яе па чыгунцы да месца пабудовы заводаў.

Аднак, калі 20 верасьня прадстаўнік будаўнічага вучастку прыбыў на станцыю Віцебск, каб праверыць ці адпраўлена цэгла на заводы, аказалася, што згодна загаду віцебскага гарсавету цэгла перадана іншым арганізацыям Віцебску. Усё гэта было зроблена такім чынам, што ніхто ў будаўнічым вучастку ня ведаў.

Пратэсты прадстаўнікоў будаўнічага вучастку і ў гарсавеце, на станцыі чыгункі ніякіх вынікаў ня далі.

Такія дзеяньні віцебскага гарсавету зрываюць будаўніцтва ільназаводаў ударнай і першай чаргі.

Мы патрабуем неадкладнага ўмяшаньня пракуратуры і прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

А.

Уборка бульбы

У правільнай арганізацыі працы—зарука перамогі

Раўняцца па калгасе „Новы Селянін“

Ён паказвае лепшы прыклад, як трэба ўбіраць бульбу

БУЛЬБА БУДЗЕ УБРАНА Ў ТЭРМІН

СТАРЫЯ ДАРОГІ.

КАЛГАС «НОВЫ СЕЛЯНІН», ДРАЖЫНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ПЕРШЫМ У РАЁНЕ РАЗГАРНУЎ МАСАВУЮ ЎБОРКУ БУЛЬБЫ. 21-ГА ВЕРАСЬНЯ БЫЎ СКЛАДЗЕН ВЫТВОРЧЫ ПЛЯН ЎБОРКІ. АПРАЧА БРЫГАД, ЯКІЯ ПАВІННЫ ЗАКАНЧВАЦЬ АЗІМУЮ СЯЎБУ, ПАБУДОВУ СЬВІНАРНІКАЎ І СІЛАСАВАНЬНЕ, УСЯ МАСА КАЛГАСЬНІКАЎ ПЕРАКЛЮЧЫЛАСЯ НА ЎБОРКУ БУЛЬБЫ.

КАЛГАСЬНІКІ І КАЛГАСЬНІЦЫ РАЗЬБІТЫ НА 10 БРЫГАД ПА 10-12 ЖАНЧЫН І АД 2 ДА 8 МУЖЧЫН У КОЖНАЙ. ДА КОЖНАЙ БРЫГАДЫ ПРЫМАЦАВАНЫ: 1 КОНЬ ДЛЯ ВОРЫВА І ПА 2-4 КАНІ ДЛЯ ПЕРАВОЗКІ БУЛЬБЫ НА МЕСЦА ХАВАНЬНЯ. БРЫГАДЫ НЯСУЦЬ ПОЎНУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА ЎВЕСЬ ІНВЭНТАР І ЗА ДОГЛЯД КОНЯЙ.

КОЖНАЙ БРЫГАДЗЕ ВЫЗНАЧАН ПЭЎНЫ ВУЧАСТАК РАБОТЫ (АД 2 ДА 2,8 ГЭКТ.). ВЫХОДЗЯЧЫ З НОРМЫ ВЫПРАЦОЎКІ (0,03 ГЭКТ. НА ВЫБІРАЛЬШЧЫЦУ) ВЫЗНАЧАН ТЭРМІН СКАНЧЭНЬНЯ ЎБОРКІ ДЛЯ КОЖНАЙ БРЫГАДЫ. ПРЫ ГЭТЫМ У ПЛЯНЕ ПРАДУГЛЕДЖАНА, З ЯКОГА ВУЧАСТКУ І КУДЫ ТРЭБА ВЫВЕЗЬЦІ ВЫКАПАНУЮ БУЛЬБУ.

23-ГА ВЕРАСЬНЯ ДЗЬВЕ БРЫГАДЫ ПРЫСТУПІЛІ ДА ЎБОРКІ БУЛЬБЫ, А 8 ЗАКАНЧВАЛІ ЗЬНІМАЦЬ БУЛЬБЯНІК. РАБОТА РАЗГАРНУЛАСЯ ПА-ЎДАРНАМУ НА АСНОВЕ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ.

З ПРЫЧЫНЫ ДАЖДЖУ ПРЫШЛОСЯ НА НЕКАТОРЫ ЧАС СПЫНІЦЬ ЎБОРКУ. АДНАК, КАЛГАСЬНІКІ ПАРАШЫЛІ НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ ПСАВАНЬНЯ БУЛЬБЫ ПАД ВАДОЙ. ЯНЫ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ МАБІЛІЗАВАНЫМІ НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВУ І ПАСТАНАВІЛІ АДРАЗУ ПАСЬЛЯ ДАЖДЖОЎ УСІМ ВЫЙСЬЦІ НА ЎБОРКУ, НА ГЭТЫ РАЗ ЛІК БРЫГАД БУДЗЕ ПАВЯЛІЧАН. ВА ЎБОРЦЫ ПРЫМУЦЬ УДЗЕЛ УСЕ БЕЗ ВЫКЛЮЧЭНЬНЯ КАЛГАСЬНІКІ.

КАЛГАСЬНІКІ-СЛУЖАЧЫЯ ТАКСАМА АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНЫМІ І АБАВЯЗАЛІСЯ АДПРАЦАВАЦЬ НА ЎБОРЦЫ БУЛЬБЫ ПА 2 ДНІ.

МОЖНА З УПЭЎНЕНАСЬЦЮ СКАЗАЦЬ, ШТО КАЛГАС «НОВЫ СЕЛЯНІН» З ПОСЬПЕХАМ І Ў ТЭРМІН СКОНЧЫЦЬ ЎБОРКУ БУЛЬБЫ. ГЭТАМУ ЗАРУКА—ДОБРА АРГАНІЗАВАНАЯ ПРАЦА І ЭНТУЗІЯЗМ КАЛГАСЬНІКАЎ.

БРЫГАДЗІР «ЗЬВЯЗДЫ» БАРЫСЭВІЧ.

МІМА МАС

Рабочыя пляны ўборкі бульбы не паказаны калгаснікам

БАРЫСАЎ

Калгасы Барысаўскага раёну павінны ўбраць 1.525 гэкт. бульбы. Аднак, тэмпы ўборкі на сёнешні дзень прымушаюць біць трывогу, бо яны ні ў якім разе не забясьпечваюць своячасовага скончэньня кампаніі. На 25 верасьня выкапана ўсяго 105 гэкт. бульбы. Гэта складае каля 8 проц. пляну. У радзе сельсаветаў—НЯМАНІЦКІМ, ЖЫТКАЎСКІМ, БЫЧАНСКІМ І ІНШ.—КАЛГАСЫ ДАГЭТУЛЬ ЯШЧЭ НЕ ПРЫСТУПІЛІ ДА ЎБОРКІ БУЛЬБЫ.

Якія-ж асноўныя прычыны адставаньня калгасаў Барысаўшчыны?

Дагэтуль яшчэ не ва ўсіх калгасах работа пераведзена на зьдзельшчыну. Са 100 калгасаў толькі 94 увялі зьдзельшчыну, а па ўборцы бульбы яшчэ менш.

У БОЛЬШАСЬЦІ КАЛГАСАЎ РАБОЧЫЯ ПЛЯНЫ КАПАНЬНЯ БУЛЬБЫ НЯ БЫЛІ АБГАВОРАНЫ НА АГУЛЬНЫХ СХОДАХ КАЛГАСЬНІКАЎ, А СКЛАДАЛІСЯ Ў ГАБІНЭТНЫМ ПАРАДКУ ПРАЎЛЕНЬНЯМІ КАЛГАСАЎ.

Вялікае значэньне ва ўборачнай кампаніі бульбы адыгрывае жаночая рабочая сіла. Аднак, калгасы Барысаўшчыны ў большасьці гэтага ня ўлічылі і нічога не зрабілі для прыцягненьня жанчын да ўборкі бульбы. Да гэтага часу ні ў адным калгасе не арганізаваны дзіцячыя ясьлі. У выніку жанчыны-калгаснікі ў значнай частцы ня могуць выйсьці на работу.

Некаторыя калгасы ГЛІВЕНСКАГА і МЕТЧЫНСКАГА сельсаветаў спадзяюцца выключна на дапамогу гарадзкіх рабочых, самі-ж нічога ня робяць для арганізацыі масавай уборкі бульбы.

Яшчэ горш стаіць справа з уборкай бульбы ў саўгасах. Апошнія павінны ўбраць 326 гэкт. бульбы. Сваімі сіламі саўгасы, бязумоўна, ня справяцца. Між тым яны дагэтуль яшчэ не завербавалі ні аднаго рабочага на ўборачную кампанію. Гэта стварае пагрозу, што саўгасная бульба застанецца зімаваць на полі.

Патрэбен рашучы пералом. Партыйныя ячэйкі калгасаў і сельсаветаў павінны неадкладна мабілізавацца на правядзеньне ўборкі бульбы, дабіцца правільнай арганізацыі працы, увядзеньня зьдзельшчыны, прыцягненьня жаночай рабочай сілы на капаньне.

Плян уборкі бульбы павінен быць даведзен да кожнага калгасніка. На аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва трэба дабіцца поўнага выкананьня і перавыкананьня норм выпрацоўкі.

Ні адно кілё бульбы не павінна застацца на полі.

Б. БАРЫСАЎСКІ.

Выклік „Чырвонага Кастрычніка“

ВУШАЧЫ. (НАШ КАР.).

21-ГА ВЕРАСЬНЯ КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» РАСПАЧАЎ МАСАВУЮ ЎБОРКУ БУЛЬБЫ. НА ДРУГІ-Ж ДЗЕНЬ КАЛГАСЬНІКІ ЎЗЯЛІ НА СЯБЕ БАЯВОЕ САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА—ДА 27 ВЕРАСЬНЯ ВЫВЕЗЬЦІ НА СТ. ЛЕПЕЛЬ ДЛЯ АДГРУЗКІ ПРАЛЕТАРСКІМ ЦЭНТРАМ НЯ МЕНШ 167 ЦЭНТ. БУЛЬБЫ.

КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» ВЫКЛІКАЎ НА САЦСПАБОРНІЦТВА НА ЛЕПШАЕ І ХУТЧЭЙШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЎБОРКІ БУЛЬБЫ НАСТУПНЫЯ КАЛГАСЫ ВУШАЧЧЫНЫ: «ЧЫРВОНАЯ ПОЛАЧЧЫНА», «ЧЫРВОНЫ ЎСХОД», ІМЯ ЛЕНІНА, ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА, «БЯЗБОЖНІК», «НОВЫ ШЛЯХ» І «ПРАЛЕТАРЫ».

ЛІПАЎКА ЯН.

МТС БССР павінны быць упераздзе

МТС БССР ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ РАЗГАРНУЛІ ЯШЧЭ МАСАВАЙ УБОРКІ БУЛЬБЫ. ПАВОДЛЕ ДАНЫХ БЕЛТРАКТАРАЦЭНТРУ НА 25 ВЕРАСЬНЯ ПА МТС БЫЛО ЎБРАНА ЎСЯГО 6,6 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

РАД МТС ДАГЭТУЛЬ ЗУСІМ ЯШЧЭ НЕ ПАЧАЛІ ЎБОРКІ. ДА ГЭТЫХ МТС АДНОСЯЦЦА: ЗАСЛАЎСКАЯ, СІРОЦІНСКАЯ, КЛІМАВІЦКАЯ, ДУБРОВЕНСКАЯ, СТАРА-ДАРОСКАЯ, БОРКАВІЦКАЯ, МЕНСКАЯ, РАГАЧОЎСКАЯ.

ТОЛЬКІ ТРЫ МТС ІДУЦЬ УПЕРАДЗЕ ПА ЎБОРЦЫ БУЛЬБЫ. ГЭТА—КАСЬЦЮКОВІЦКАЯ, ЯКАЯ ВЫКАНАЛА 28,4 ПРОЦ. ПЛЯНУ, ГАРАДОЦКАЯ —23,9 ПРОЦ., І СЛУЦКАЯ—20 ПРОЦ.

Убрана 30,5 проц. пляну

ЖЛОБІН. (НАШ. КАР.).

ПА ЖЛОБІНСКІМ РАЁНЕ РАЗГАРНУЛАСЯ МАСАВАЯ ЎБОРКА БУЛЬБЫ. НА 25 ВЕРАСЬНЯ ЎБРАНА 3.682 ГЭКТ., ШТО СКЛАДАЕ 30,5 ПРОЦ. АГУЛЬНАГА ПЛЯНУ.

МАШНІЦКІ.

ПА-ЎДАРНАМУ РАЗГАРНУЛІ ЎБОРКУ

ЧЭРВЕНЬ.

Дзякуючы добра арганізаванай працы і ўвядзеньню зьдзельшчыны калгас «Краіна Саветаў» (Горкаўскі сельсавет) з посьпехам скончыў уборку ўраджаю. Ужо абмалочана ўсё жыта. 11,5 цэнтн. жыта здана дзяржаве.

Сяўба азімага кліну таксама скончана. Плян сяўбы перавыкананы па 6 гэкт.

Зараз прыступілі да ўборкі бульбы. Работа вядзецца па-ўдарнаму. Ужо здана ў ніж загатовак 167 цэнтн. бульбы, што складае 35 проц. заданьня.

Калгаснікі асудзілі бязьдзейнасьць праўленьня і самі ўзяліся за сіласаваньне

Сіласаваньне па Жлобінскім раёне зрываецца. На 25 верасьня засіласавана толькі 2.846 тон, або 17,6 проц. пляну.

Да гэтага часу не прыступілі да сіласаваньня Нова-Маркаўскі, Папаратнянскі і рад іншых сельсаветаў, а таксама аднаасобны сэктар.

На першым месцы па сіласаваньні—МАЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ (выканаў плян на 65,8 проц.), СКЯПНЯНСКІ—на 64,8 проц.

КАЛГАСЫ СКЯПНЯНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ ЗАДАНЬНЕ ПА СІЛАСЕ ВЫКАНАЛІ НА 175 ПРОЦ.

Праўленьне калгасу «Трэці рашаючы» ад сіласаваньня адмовілася. Сход калгаснікаў рашуча асудзіў апартуністычную бязьдзейнасьць праўленьня і парашыў зараз-жа распачаць сіласаваньне. На заўтра калгаснікі Казлова Б., Стальчык П., Стальчык К., абвясьцілі сябе ўдарнікамі, выкапалі сіласную яму.

Праўленцы, замест дапамогі ўдарнікам, лаюць іх за «непатрэбную працу».

Раённыя арганізацыі ня прыцягваюць да адказнасьці праўленьні калгасаў, якія зрываюць сіласнае будаўніцтва.

Машчыцкі

Калгас „Беларусь“ паказаў прыклад

ЗАМЕСТ 120—150

Калгас «Беларусь», Бягомльскага раёну, плян сіласаваньня выканаў з перавышэньнем. Замест 120 тон, засіласавана 150. Засіласаваны 4 ямы, падрыхтавана 50 тон зялёнай масы для закладкі пятай ямы.

Узоры ўдарнай работы па сіласаваньні паказалі калгаснікі. Склаўшы брыгаду, яны высунулі свой сустрэчны плян—120 замест тон—150 тон. Ударніца Сьцяпурка М. ад імя ўсіх калгаснікаў абвясьціла брыгаду ўдарнай, абавязаўшыся працаваць і ў выходныя дні.

Дзякуючы ўдарным тэмпам работы, калгас „Беларусь“ перавыканаў плян сіласаваньня.

Ал. Калевіч.

Усебеларускі конкурс на лепшыя калгасныя фэрмы

Сілас—гэта тысячы дадатковых тон мяса, малака і масла

Перадавыя калгасы, якія скончылі сіласаваньне на дапамогу адстаючым, пакажэце ім як змагацца за кармовую базу

ПЛЯН ПЕРАВЫКАНАН

СЛУЦАК. (Наш кар.). Калгас «БАТРАК» першым у Слуцкім раёне выканаў плян сіласаваньня. У калгасе быў абвешчан ударны пяцідзеньнік, які даў вельмі добрыя вынікі. Плян райкалгасаюзу ў 120 тон перавыканан на 5 тон (засіласавана 125 тон).

Гэтых посьпехаў калгас дабіўся дзякуючы стопроцантнаму ўкараненьню зьдзельшчыны, нападжанаму ўліку працы, сацспаборніцтву і ўдарніцтву.

Адзначаючы зусім ганебнае становішча з сіласаваньнем у суседнім калгасе, калгаснікі калгасу «Батрак» пастанавілі наладзіць суботнік у дапамогу адстаючаму калгасу.

Калгасы Случчыны, раўняйцеся па калгасе «БАТРАК», вучэцеся ў яго перамагаць на фронце сіласнага будаўніцтва.

ЖЫЛКА.

Зламаць апартуністычнае супраціўленьне

Кічаўскі раён, зьяўляючыся жывёлагадоўчым, ганебна правальвае мерапрыемствы па стварэньні кармовай базы ўнутры калгасаў.

Безгаспадарчасьць у радзе калгасаў прывяла да таго, што сотні гэктараў сенажаці яшчэ ня скошаны. У калгасе імя Молатава ня скошана 225 гэкт., у калгасе «Авангард»—30 гэкт. У гэтых-жа калгасах замест 700 кбм. сіласных ям, паводле пляну, выкапана толькі 200 кбм. Калгас «Гігант» замест 100 кбм. ям выкапаў 34. Усяго па раёне плян сіласаваньня выканан на 14,5 проц.

З 123 калгасаў раёну выканалі 25 проц. сіласаваньня толькі 5 калгасаў (імя Дзяржынскага, «Беларусь», «Бацэвічы», імя Леніна і «Пяцігодка»).

Калгасы «Галубок», «Гонча» і інш. упарта адмаўляюцца ад сіласаваньня. «У нас бяз сіласу хопіць кармоў»,—заўляюць старшыні калгасаў, між тым, плян сеназагатовак гэтымі калгасамі ня выканан, кармовыя фонды ня створаны.

Верасень—рашаючы месяц сіласаваньня. Арганізацыяй спэцыяльных ударных брыгад, сацспаборніцтвам паміж імі—райарганізацыі павінны дабіцца рашучага пералому ў выкананьні пляну сіласаваньня.

ФРЫСМАН.

50 проц. атавы б

Год выданьня—XV
№ 265 (4168)
Аўторак, 29 верасьня 1931
Цана нумара 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мін. Гархому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27,—сакрэтар—10-74, намгэстар—13-80, бел. рэмл.—6-19, рэвсцыя і арм.—6-19, замест. інфарм.—6-19, нацы. рэдактар—6-42, міжгародняй інфармацыі—10-74, кантора і рахунк.—8, рэдакцыі абаненты—7-1

Фашысцкія каты апярэдзілі сваіх настаўнікаў-царскіх ахраньнікаў, шпіёнаў і турэмшчыкаў

Гісторыя клясавай барацьбы яшчэ ня ведала такой масавай галадоўкі, як ўсеагульная галадоўка ў турмах Польшчы

Агульна-гарадзкі мітынг рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных гор. **Шкова** пратэстуе супроць гвалтаў, якія творацца ў польскіх турмах над палітзьняволенымі рабочымі і сялянамі, і выказвае сваю брацкую салідарнасьць з барацьбой 10.000 рэвалюцыянэраў-палоньнікаў. **Фашыстам ня ўдасца закавяць рэвалюцыйны рух у кайданы.** Рэвалюцыя няўхільна набліжаецца і недалёка той час, калі яна зьмяце дыктатуру турмаў і шыбеніц з зямлі.

У адказ разьюшаным фашыстам мы абавязваемся перавыканаць кантрольныя лічбы па зімовай дапамозе палітзьняволеным, абавязваемся ўзмацніць рады МОПР'у і Асоавіяхіму.

***

Агульны сход **калектыву мэсанработнікаў пры аршанскім доме адпачынку** далучаецца да шматмільённых пратэстаў супроць разгулу белага тэрору за сьценамі турэмных казэматаў Польшчы. Мы патрабуем **зараз-жа спыніць зьдзекі** над палітзьняволенымі і вярнуць ім іх правы.

У фонд дапамогі зьняволеным братом, як адказ польскім фашыстам, **мы адлічаем свой аднадзенны заработак.**

***

Рабочыя менскай каўбаснай фабрыкі, пратэстуючы супроць увядзеньня ў польскіх турмах новага рэгляманту, **у адказ польскім фашыстам** пастанаўляюць адпрацаваць **адзін дзень у фонд матарызацыі пагранічасьцей Чырвонай армії і выклікаюць пасьледвацъ іх прыкладу ўвесь мясакамбінат, цукерную фабрыку «Камунарка» і Белмяса.**

Агульны сход **рабочых і тэхнічнага пэрсаналу другой дыстанцыі Захчыгунбуду** ў колькасьці 273 чалавек катэгарычна пратэстуе супроць крывавых расправаў, якія ўчыняе польскі фашызм над 10.000 зьняволеных рабочых і сялян.

У адказ на белы тэрор мы абвяшчаем сябе ўдарнікамі, **усе уступаем у рады МОПР'у і Асоавіяхіму.**

На прапанову рабочага тав. **Іванова,** які ўнёс на мітынгу **3 рублі** ў фонд дапамогі палітзьняволеным выклікаў усіх прысутных, **тут-жа сабрана 117 руб.** Збор грошай ідзе далей. Рабочыя выклікаюць пасьледаваць іх прыкладу **8-мы вучастак, першую і трэцюю дыстанцыі Захчыгунбуду.**

***

Агульны сход супрацоўнікаў Дзяржпляну БССР, заслухаўшы інфармацыю б. генэральнага сакратара Рабоча-Сялянскай Грамады **тав. Бурсэвіча** аб усеагульнай галадоўцы палітзьняволеных у Польшчы, а абурэньнем пратэстуе супроць **сыстэмы зьдзекаў і катаваньняў у польскіх турмах,** супроць перавядзеньня палітзьняволеных на крымінальны рэжым, **супроць асуджэньня на павольнае выміраньне дзесяці тысяч папольнікаў-рэвалюцыянэраў.**

— Мы выказваем сваю салідарнасьць з барацьбой зьняволеных братоў і ў адказ гэтай салідарнасьці **ўсе,** як адзін, **уступаем у рады МОПР'у.**

— Мы шлем свой праклён акупантам Зах. Беларусі і Зах. Украіны. Час расплаты недалёкі. **У хуткім часе на лаву падсудных сядуць сёньняшнія акупанты каты.**

***

Рабочыя заводу «Ударнік» (Менск) шлюць сваё баявое пралетарскае прывітаньне дзесяці тысячамі палітзьняволеных—**лепшым барацьбітом за вызваленьне рабоча-сялянскіх мас Зах. Беларусі і Зах. Украіны з-пад ярма фашысцкай акупацыі, за савецкую Польшчу.**

— Мы пратэстуем супроць нячуваных зьдзекаў над нашымі братамі па клясе і дамагаемся зараз-жа гэтых зьдзекі спыніць.

У адказ на зьверствы польскага фашызму рабочыя заводу **«Ударнік»** бяруць на сябе абавязак—**ліквідаваць прарывы, выканаць датэрмінова прамфінплян трэцяга рашаючага, дадаткова рэалізаваць падпіску на пазыку, усім уступіць у рады МОПР'у, выканаць і перавыканаць кантрольныя лічбы па дапамозе палітзьняволеным.**

***

Калектыў рабочых саўгасаў «Пагост», Старобінскага раёну рашуча пратэстуе супроць фізычнага зьнішчэньня **рэвалюцыйнага авангарду**—палітзьняволеных у Польшчы.

— **У адказ на дзікі тэрор у белапанскай Польшчы** мы ўсе, як адзін уступаем **у рады МОПР'у і Асоавіяхіму і адлічаем 1 проц. месячнага заработку ў фонд дапамогі палітзьняволеным.**

***

Супрацоўнікі **Белжылсаюзу і Гаржылсаюзу** пастанавілі на сваім агульным сходзе **адлічыць 1 проц. месячнай пэнсіі** ў фонд дапамогі палітзьняволеным, як адзнака салідарнасьці з іх барацьбой і як адказ польскаму фашызму.

Фунт знаходзіць шматлікіх насьлядоўцаў

ОСЛО, 27. У Нарвэгіі часова скасоўваецца залаты стандарт і ўводзіцца забарона на вываз золата за граніцу. Адначасова вучотная стаўка павышаецца да 8 процантаў.

***

СТАКГОЛЬМ, 27. Швэдзкі рэйхсбанк павысіў вучотную стаўку да 8 процантаў. Урад спыніў да канца лістапада абмен банкнот на золата і забараніў вываз золата са Швэцыі.

Мікрафон на заводы

Беларускі радыёцэнтр прыступіў да канкрэтнай перабудовы сваёй работы. Па пастанове ЦК КП(б)Б замест існаваўшай раней адной абласьлічанай Беларускай радыёгазэты, зараз арганізаваны чатыры штодзённыя радыёгазэты: Рабочая—**«За бальшавіцкія тэмпы»,** калгасная—**«Калгасны заклік»,** камсамольская—**«Камсамолец Беларусі»** і піянэрская—**«Піянэр Беларусі,** а таксама яўрэйская, якая выдаецца два разы ў дэкаду.

Яшчэ з-за адсутнасьці кадраў ня выканана пастанова ЦК КП(б)Б аб арганізацыі нацыянальных радыёгазэт: польскай, літоўскай і латыскай.

Адпаведныя арганізацыі павінны зрабіць усё неабходнае, каб і гэтыя нацыянальныя газэты змаглі ўвайсьці ў строй бальшавіцкага друку.

Беларускія радыёгазэты за 2 месяцы існаваньня маюць рад дасягненьняў. З тэксту радыёгазэт зусім выкаранены выразкі з друкаваных газэт. Газэты будуюцца на ўласным матэр'яле рабселькораў. За час двухдэкадніка праведзены два масавых рэйды. **Арганізаваны ўдарныя брыгады друку.**

Але разам з гэтым ёсьць і рад прарываў. Газэты недастаткова **палучарыхаваны** сярод **працоўнага насельніцтва, ня прыцягнута поўнасьцю маса рабселькораў.** Зусім мала **апэрацыйнасьці** ў рабоце, адсутнічае барацьба за **дзейснасьць** газэтнага матэр'ялу.

З мэтай папулярызацыі радыёвяшчаньня сярод мільённых мас—радыё-газэты павінны шырэй праводзіць радыёмітынгі, перакліччі фабрык і заводаў, саўгасаў і калгасаў, арганізоўваць фабрычна-заводзкія радыёгазэты, часьцей выносіць мікрафон на прадпрыемствы.

Мачульскі.

Вялікая зацікаўленасьць рабочых беларускай пралетарскай літаратурай

ВІЦЕБСК, 28/IX—(Белта). Брыгада пісьменьнікаў БелАПП'у правяла рад літаратурных вечароў і гутарак на буйнейшых прадпрыемствах гораду — на фабрыцы «Дзьвіна», на заводзе «Чырвоны металіст», **«Сьцяг** індустрыялізацыі», акулярнай фабрыцы, і радыёвузьле.

Пісьменьнікі горача былі спатканы на сходах партыйнага і камсамольскага актыву. **Рабочыя фабрыкі «Дзьвіна»** віталі **Андрэя Александровіча** у сувязі з дзесяцігодзьдзем яго **літаратурнай** дзейнасьці.

Бюро гаркому КП(б)Б, падагуліўшы работу брыгады, адзначыла, што выступленьні і даклады пралетарскіх пісьменьнікаў садзейнічалі папулярызацыі сярод рабочых дасягненьняў партыі ў правядзеньні нац. палітыкі, а таксама паказалі вялікую зацікаўленасьць рабочых **беларускай пралетарскай літаратурай.**

Бюро гаркому партыі намецілі рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўзмацненьні літаратурнага руху ў Віцебску. Гаданіна закліку ўдарнікаў у літаратуру адзначана стварэньнем дзесяткаў новых літаратурных гурткоў на фабрыках і заводах.

Японская ваеншчына гаспадарыць у Манчжурыі

Кітай ахоплен магутным антыімпэрыялістычным рухам

„Незалежнасьць" пад штыхамі



Жэрлы гармат японскіх браняносцаў накіраваны на Кітай.

ШАНХАЙ, 27. Японскія колы ў Кітаі ўзмоцнена распускаюць чуткі аб **антыяпонскіх выступленьнях,** якія рыхтуюцца ў даліне Янцзы. У добра асьвядомленых колах гэта расцэньваецца, як адзнака новай японскай правакацыі рыхтуецца і **дасьць Японіі повад прадпрыймаць новыя рашучыя баі на гэты раз у цэнтральным Кітаі.**

Лічаць, што Японія ня спыніцца нават перад **акупацыяй Нанкіну** для таго, каб прымусіць нанкінскі ўрад, па-першае, вырашыць усе япона-кітайскія спрэчкі ў пажаданым для Японіі духу, па-другое, прызнаць незалежнасьць Манчжурыі, якою будзе кіраваць які-небудзь стаўленік Японіі. Характэрна адзначыць, што цыркулююць ужо чуткі аб руху незалежнасьці, які ўжо пачаўся ў Японіі.

У Шанхаі чакаюцца, апрача крэйсэра «Цусіма», які ўжо вышаў з порту Сасобо, **яшчэ некалькі японскіх ваенных суднаў.**

***

ШАНХАЙ, 11. Японская газэта «Шанхай-Майніцы» паведамляе, што чырвоныя армії Цзянсі, якія яшчэ параўнальна нядаўна адступалі ў горы, прадпрынялі контр-наступленьне, нанёсшы нанкінскім войскам сур'ёзныя паражаньні. З дапамогай нанкінскіх часьцей, якія перайшлі на бок чырвоных, апошнія прасоўваюцца на поўдня, выцясьняючы ўрадавыя часьці. Газэта паведамляе, што шостая ўрадавая дывізія ў баёх з чырвонымі ў раёне гораду Гань страціла палову свайго складу,—8 дывізія было поўнасьцю зьнішчана чырвонымі ў раёне Гуанча. 45-я дывізія таксама панесла вялікія страты і была ўведзена ў тыл. Наогул 19-я армія, у якую ўваходзяць усе гэтыя часьці, панесла вялізарнейшыя паражаньні. Другая японская газэта «Шанхай Ніпо» лічыць, што апошнія перамогі чырвоных зноў ставілі пагрозу Нанчану.



Карта Манчжурыі.

ШАНХАЙ, 27 У Нанчане (сталіца Цзянсі) адбыўся пяцідзесяцітысячны антыяпонскі мітынг. У Чанша (Хуналь) у антыяпонскай дэманстрацыі прымала ўдзел звыш 100.000 чалавек. У Сватоў, Нінбо і інш. буйных гарадох Кітаю таксама адбыліся грандыёзныя мітынгі, якія патрабавалі ў сваіх рэзалюцыях «рашучай палітыкі» ў адносінах Японіі.

Бомбы і кулямёты па мірным насельніцтве

ШАНХАЙ, 26. Згодна кітайскіх паведамленьняў, японскія войскі, якія поўнасьцю захапілі ў свае рукі кантроль над **Гірыньскай і Мукдэнскай правінцыямі,** прымусілі адміністрацыю чыгункі розных станцый на чатырох кітайскіх чыгунках узьняць японскія сьцягі. **Ваенныя аэрапляны пётаюць над вёскамі і гарадкамі Манчжурыі, скідаючы ад часу да часу бомбы.** У Тунляо і Кашадзэ японцы спралялі з кулямётаў у грамадзянскае насельніцтва акупаванай тэрыторыі.

Антыяпонскі рух у Кітаі

ШАНХАЙ, 26. Сёньня большая частка кітайскіх магазынаў, банкаў і ўрадавых устаноў **закрыта.** Вуліцы перапоўнены. У кітайскай частцы гораду адбыўся грандыёзны мітынг, на які зьявілася звыш **100.000 чалавек.** На сьцягах і транспарантах напісаны лёзунгі, якія ад ураду патрабуюць **цьвёрдай палітыкі ў адносінах да Японіі.** Сярод лёзунгаў ёсьць шмат накіраваных супроць гамінданў і нанкінскага ўраду. Хваля антыяпонскага руху па ўсёй краіне пашырасьцца, асабліва ахапіўшы моладзь. Мяркуючы па ўсіх адзнаках, студэнцтва цьвёрда пастановіла не прыступаць да заняткаў да тэй пары, пакуль ня будзе ліквідаваны канфлікт з Японіяй. Каля **4.500 студэнтаў выступаюць з пенцыямі ў розных частках кітайскага гораду** і замежнага сэтльмэнту ў Шанхаі, заклікаючы **да вайны супроць Японіі**

Кітайскія часьці адступаюць

ТОКІЁ, 27. Паводле паведамленьня агэнцтва Сімбун Рэнго з Мукдэну, японскія самалёты бамбардавалі ўчора рэшткі кітайскіх войск, якія пакрывалі Тацьенсе (у 10 мілях да паўночнага ўсходу ад Мукдэну). Па японскай вэрсіі, готыя войскі разабралі 18 верасьня лінію Паўднёва-Манчжурскай чыгункі.

***

СТАКГОЛЬМ, 25. Пераважная частка дацкага друку патрабуе пасьледваць прыкладу Англіі і скасаваць залаты парытэт.

Нарвэзкая рэфармісцкая «Арбэйтэрбладэс» абараняе неабходнасьць сьледваньня ангельскаму прыкладу.

***

БЭЙПІН, 25. Кітайскі друк у Манчжурыі з найінфармаваных крыніц паведамляе, што гэтымі днямі ў Кантон прыбылі з Японіі ваенныя дарадчыкі, а таксама 5 японскіх спэцыялістаў, запрошаных на работу ў кантонскі арсэнал. Апрача таго, у якасьці дарадчыка пры кантонскім урадзе працуе брат японскага консула ў Кантоне.

Як вядома, у часе нядаўняга прабываньня Яўгеніі Чэна ў Токіё, японскія ўрадавыя колы афіцыяльна абвяргалі сваю сувязь з ім і, у прыватнасьці, адмаўлялі паведамленьні аб тым, што Яўгені Чэн прасіў аб снабжэньні Кантона зброяй і аб камандыроўцы ў Кантон ваенных дарадчыкаў.

***

ЖЭНЭВА, 27. Як паведамляюць, кітайскі ўрад не адважыцца зноў апэляваць Савету Лігі Нацый — ужо на падставе артыкулу 15 статуту Лігі Нацый на дзеяньні Японіі ў Манчжурыі. Замест гэтага, як перадаюць, у кітайскіх колах разьвілася новая ідэя — патрабаваць перадачы на разгляд Гаагскага трыбуналу пытаньня аб вытлумачэньні дагавораў 1905-1915 г. г., на якіх аснованы асобыя правы Японіі ў Манчжурыі. У японскіх колах «сумняваюцца» ў кампэтэнцыі Гаагі па гэтых дагаворах.

***

БЭЙПІН, 27. Як паведамляюць з Харбіну, консулы Злучаных Штатаў у Англіі ў гутарцы з журналістамі заявілі, што яны мяркуюць, што парадак у Манчжурыі будзе захаваны і **без умяшаньня дзяржаў.**

Апал прамысловасьці і рабочым цэнтрам

44,1%—ГАНЕБНА МАЛА

Узмацніць тэмпы вывазкі дроў

Раўняцца па Віцебскім леспрамгасе, які перавыканаў гадавое заданьне па вывазцы

Гадавое заданьне па вывазцы дроў на 21 верасьня выканана ўсяго на 44,1 проц. Вывезена 2.830.973 кбм. дроў.

Наперадзе па вывазцы дроў ідуць ВІЦЕБСКІ леспрамгас, які даў 126,4 проц. заданьня, СЛУЦКІ — 97,7 проц., МЕНСКІ—85,2 проц., УБОРАЦКІ— 82,2 проц., БЕШАНКОВІЦКІ—81,0 проц., МАГІЛЕЎСКІ—80,6 проц., ГАРАДОЦКІ—73,7 проц.

Ганебна адстаюць на працягу ўсяго часу ТУРАЎСКІ леспрамгас, які выканаў гадавы плян па вывазцы дроў на 17,7 проц., ГЛУСКІ—25,4 проц., БОРКАВІЦКІ—28,2 проц., БАБРУЙСКІ—28,9 проц., ЧАЧЭРСКІ—29,4 проц., ЛЕПЕЛЬСКІ—31,5 проц, РЭЧЫЦКІ—31,2 проц., БЯРЭЗІНСКІ—32,4 проц., БЫХАЎСКІ—34,4 проц., АСІПАВІЦКІ—34,2 проц., ПРАПОЙСКІ—33,0 проц.

Аб забесьпячэньні гор. Менску дрывамі

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Адзначаючы, што дырэктыва аб завозе ў гор. Менск у парыяд з мая да кастрычніка 1931 г. 10.000 вагонаў дроў Лесбелам ня выканана, што зрывае нармальнае снабжэньне гораду дрывамі, і што Менскі гарадзкі савет ня змог дабіцца забесьпячэньня выкананьня пляну завозу дроў і выкананьня пляну загатоўкі дроў Менскім леспрамгасам, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Лесбел забясьпечыць завоз у гор. Менск у кастрычніку і лістападзе ня менш як на 100 вагонаў дроў штодзенна з тым, каб было забясьпечана нармальнае забесьпячэньне дрывамі ўжо ў кастрычніку і створан двухмесячны запас дроў.

2. З прычыны абсалютна нездавальняючага забесьпячэньня дрывамі гор. Менску і недастатковай колькасьці вагонаў, якія падаюцца пад дровы, абавязаць Універсальнага Народнага Камісарыяту Шляхоў пры СНК БССР тав. Палюдава ўжыць захады для забесьпячэньня завозу ня менш як па 100 вагонаў дроў штодзенна як па лініі МБВ, так і па лініі Заходніх чыгунак.

3. Для максымальнага скарачэньня стаянкі вагонаў пад пагрузкай і выгрузкай устанавіць, што пад пагрузкай вагоны павінны стаяць ня больш трох гадзін, а пад выгрузкай—дзьвёх гадзін.

Абавязаць Лесбел забясьпечыць на мясцох свячасовую дастаўку дроў да чыгункі для пагрузкі, а таксама і рабочай сілай пагрузку.

4. Прапанаваць Беларускай Канторы Саюзтранс на працягу трох дзён арганізаваць у гор. Менску рабочую арцель для выгрузкі дроў, якая павінна забясьпечыць такі парадак работы, каб вагоны выгружаліся на працягу дзьвёх гадзін з часу падачы вагону.

5. Абавязаць дырэкцыю Эльвода і Бел торфаб'яднаньне неадкладна пачаць вывазку торфу з такім разьлікам, каб на працягу кастрычніка-лістапада забясьпечыць двухмесячным запасам апалу менскую электрастанцыю.

Абавязаць Лесбел на працягу кастрычніка-лістапада стварыць ня менш месячнага запасу дроў, паводле пляну забесьпячэньня Эльводу.

6. Абавязаць менскі гарадзкі савет устанавіць такі парадак работы на снабжэньні гор. Менску дрывамі, які-б забясьпечваў выкананьне гэтай пастановы.

7. Абавязаць усе прадпрыемствы і ўстановы захоўваць максымальную эканомію апалу.

8. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты ўжыць усе захады да падвозкі дроў да тых пунктаў чыгункі, з якіх дровы вывозяцца ў гор. Менск.

Нам. старшыні Савету Народных Камісараў БССР—А. КАЛНІН.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР
—С. КАНДЫБОВІЧ.

Фабрыкі і заводы Магілева павінны бесперабойна забясьпечвацца дрывамі

Магілёў забясьпечан апалам прыблізна на 30 проц. Раду фабрык і заводаў з-за адсутнасьці патрэбнай колькасьці апалу пагражае зрыў нармальнай работы.

Так, гарбарня імя Сталіна павінна атрымаць 1.500 кбм., а атрымала ўсяго 200 кбм. Швэйная фабрыка імя Валадарскага замест 2.000 кбм. атрымала толькі 98. Цукерная фабрыка атрымала 125 кбм. замест прадугледжаных плянам 700 кбм.

Рабочыя брыгады гарбарні імя Сталіна і швэйнай фабрыкі імя Валадарскага, якія працавалі месяц на дровазагатоўках, паведамляюць, што **Быхаўскі леспрамгас** злачынна адносіцца да выкананьня вызначанага яму ўрадам заданьня па дровазагатоўках.

Быхаўскі райвыканком і РК КП(б)Б стаяць у баку ад гэтай работы. Работа леспрамгасу не правяраецца. Нічога ня зроблена ў справе рэалізацыі ваат асноўных пунктаў пастановы ЦКК-НК РСІ БССР аб дровазагатоўках.

У рэзультаце заданьне па дровазагатоўках у трэцім квартале выканана прыблізна на 5 проц.

Быхаўскія райарганізацыі і ў першую чаргу РК КП(б)Б павінны неадкладна дабіцца рашучага пералому ў рабоце леспрамгасу, з-за безадказнасьці якога буйнейшыя прадпрыемствы г. Магілева яшчэ не забясьпечаны апалам.

Брыгада друку: **Сяпец, Бэйш, Лодысеў, Дубаў, Гольдзін, Брук.**

Нама часу займацца вывазкай дроў

Уваравіцкі раён пякага зруху ў справе дровазагатовак і вывазкі не дабіўся.

Райком партыі і райвыканком ня кіруюць работай леспрамгасу, ня прымаюць ніякіх захадаў да тых сельсаветаў, якія ня выконваюць сваіх заданьняў як па загатоўках, так і па вывазцы.

Гусявіцкі сельсавет абавязан вывезьці 1.000 кбм., а вывез толькі... 2 кбм. **Селянаўскі** сельсавет замест 7.000 кбм. вывез усяго 8,5 кбм., **Борхаўскі** вывез 27 кбм., а павінен быў вывезьці 5.000 кбм. **Бярвенаўскі, Вольскі, Крыўскі** і рад інш. сельсаветаў на вывезьлі з лесу ні воднага кбм.

Гэтыя сельсаветы па-апартуністычнаму недаацэньваюць работы па вывазцы дроў, спасылаючыся на тое, што зараз «нама часу займацца вывазкай дроў»!

Бязьдзейнасьці раённых арганізацый на гэтым важнейшым вучастку работы трэба пакласьці канец.

Неабходна па-баявому ўключыцца ў работу па дровазагатоўках і вывазцы.

Казіміраў.

Узорная работа

Студэнты Магілёўскага палітасьветнага тэхнікуму пажадалі ўзоры баявой работы на фронце дровазагатовак. Для таго, каб забясьпечыць тэхнікум апалам, 35 студэнтаў выехалі на працу ў Лохвінскую дачу. У першыя ж дні былі арганізаваны 5 ударных брыгад, якія заключылі паміж сабою дагаворы на сацспаборніцтва. Кожны дзень пасьля работы брыгады зьбіраліся і праводзілі вытворчыя нарады, дзе абгаварваліся пытаньні лепшай пастаноўкі работы на дровазагатоўках. Студэнты выпускалі штодзённы бюлетэнь, у якім адзначаліся дасягненьні ў рабоце кожнай брыгады, вялася барацьба з абязьлічкай. Да кожнага рабочага - студэнта быў прымацаваны інструмант да канца загатовак. У барацьбе за высокія тэмпы работы брыгада студэнта **Пархоменні** складвала за дзень 20 кубамэтраў дроў.

За 8 дзён работы на дровазагатоўках студэнты загатовілі з. 238 кубамэтраў дроў і зложылі 600 кубамэтраў.

Ю. Снытко.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

„ЧЫРВ. ЗОРКА" Пач. 7; 8-45; 10-30 — Першы гукавы мастацкі фільм **Пуцёўка ў жыцьцё** драма ў 34 эпізодах.

„КУЛЬТУРА" Пач. 7, 8-45, 10-30 — Новы мастацкі фільм **РАЗГРОМ**

Кдкр. з 12 г. дня — Мастацкі фільм **ЛУНА ЗЬЛЕВА** Звыш прагр. хроніка Саюзкіно

ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня. — Толькі 3 дні: 29, 30 і 1-X Мастацкі фільм: **БАНДА БАЦЬКІ КНЫША** Звыш. прагр. хроніка С. Саюзкіно № 48

„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — **СІНІЯ КАУНЯРЫ** кіна-аповесьць у 5 частках. Пач. у 1 г. і 2 г. 30 м. Каса—з 11 г. дня

„СПАРТАК" Пач. 7-15, 9 і 10-45 Касе адкрыта з 5 г. — Мастацкі фільм **СІМБА** 6 частках.

ЦК МОПР'у БССР
ЗВАРОЧВАЕЦЦА
да ўсіх арганізацый і ўстаноў,
дзе ёсьць сабраныя сродкі на дапамогу палітзьняволеным Польшчы, замест вяжка на магілу таварыша КАНЧЭЎСКАГА, у 5-дзены тэрмін перацлаць гэтыя сродкі на бягучы рахунак Менск. Аддзяленьня Дзяржбанку за № 86-101969, аб чым паведаміць ЦК МОПР'у БССР.
ЦК МОПР БССР.

Сёньня, 29 верасьня, у 6 гадз. веч., у аўдыторыі анатамічнага корпусу адбудзецца
лекцыя праф. Валабынскага
для студэнтаў усіх факультэтаў мэд. інстытуту навуковых працаўнікоў на тэму **„Тэорыя і гісторыя у навуцы".** Таксама запрашаюцца дактары—члены навуковай асацыяцыі.

Сьмілавіцкі новаз-адкрываемы с.-г. тэхнікум буйнай рагатай жывёлы і малочнай прамысловасьці
абвяшчае прыём на 1-шы курс
Тэрмінавучаньня 2 пол. гады
Прымаюцца асобы, скончыўшыя 7-годку або маючыя падрыхтоўку ў абхвале 7-годкі. Могуць быць прыняты асобы з ведамі ніжэй 7-годкі, якія маюць практычны вопыт работы па жывёлагадоўлі і веды ў аб'ёме ня менш 6 груп.
Заявы накіроўваць: м. Сьмілавічы, Пухавіцкі р-н. памкім. б. РВК, с.-г. тэхнікуму. Дакументы, згодна даведніку НКА, як і для іншых тэхнікумаў.
Залічаньня ў тэхнікум забясьпечваюцца інтэрнатам і 50 проц. слухачоў—сыпэндыямі.
Заявы прымаюцца да 25 кастрычніка.
Дырэкцыя тэхнікуму.

Беларускі геалёга-разьведачны трэст
„БЕЛГЕАЛРАЗЬВЕДКА"
ЗАПРАШАЕ
асоб скончыўшых Бел. сельска-гаспадарчую акадэмію і прыродазнаўчае аддзяленьне БДУ
для пасылкі ў Ленінградзкі і Маскоўскі геалёга-разьведачныя інстытуты
для перакваліфікацыі па спэцыяльнасьцях: інжынэраў-геалёгаў, геалёгаў-эканамістаў, інжынэраў-разьведчыкаў, гідрогеолёгаў, геофізыкаў, а таксама для пасылкі ў Акадэмію Навук СССР па спэцыяльнасьцях запропеляведаў.
Заявы накіроўваць у сэктар кадраў Белгеалразьведкі, Менск, пляц Волі, 21-1, ВСНГ БССР.

Сёньня, 29 верасьня, у 7 гадз. веч., у памяшк. Гарпрафсавету (Пляц Волі, 23-2)
Гарпрафсавет і Гарінспэктура асьветы склікаюць нараду
ўсіх старшынь ФЗМК, культпрапаўнікоў і загадчыкаў школ і старшынь прафактыву навучальных устаноў,
па пытаньні аб рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб масавай і сярэдняй школе і правядзеньні дэкадніка праверкі школ.
Яўка абавязкова. За няяўку будуць прыцягнуты да адказнасьці.
Гарпрафсавет. Гарінспэктура асьветы.

БЕЛПТУШКАПРАДУКТ ЗАПРАШАЕ на сталыя пасады: 1) Ст. бухгальтароў—2. 2) Бухгальтара-калькулятара) (на пасаду інструктара—1). 3) Эканамістаў—2, 4) Эпэрацыйных працаўнікоў па загатоўках, якія маюць практычны вопыт цэнтр. працы ў гэтай галіне —3. 5) Агранома-зоатэхніка—1.
Аплата па згодзе
Зварачацца па адрасе: Менск, Пляц Волі, № 7—2-гі паверх, Белптушкапрадукт.

Камуністычны Універсытэт Беларусі імя У. І. ЛЕНІНА
абвяшчае,
што пры Заочна-Курэсным Сэктары Камвузу Беларусі адкрываецца
ГАЗЭТНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ
Умовы прыёму такія-ж, як у Заочны Камвуз. Перайдзе адасобна, якія маюць практыку газэтнай працы і рабселькораў-ударнікам.
Камвуз Беларусі імя У. І. ЛЕНІНА.

...У мэтах арганізацыі кіраўніцтва масавай тэхнічнай прапагандай, папуляризацыі тэхнічных плянаў сацыялістычнай рэканструкцыі, краіны, унядрэньня навейшых дасягненьняў сусьветнай тэхнікі і тэхлітаратуры, а таксама мабілізацыі тэхнічнай грамадзкасьці: лічыць неабходным стварэньне спэцыяльнай тэхнічнай газэты пры ВСНГ СССР".
ЦК УсеКП(б).
(З пост. ад 5 жніўня 1931 г.).

У КАСТРЫЧНІКУ ПАЧЫНАЕ ВЫХОДЗІЦЬ ВЯЛІКАЯ ТЭХНІЧНАЯ ГАЗЭТА
Орган ВСНГ СССР
Выданьне газэты „За Индустриализацию"
„ТЕХНИКА"—агітатар, прапагандыст і арганізатар мас на барацьбу за тэхнічную рэканструкцыю СССР, за сацыялістычную рацыяналізацыю.
„ТЕХНИКА"—орган барацьбы за кадры сацыялістычнай рэканструкцыі, за перабудову сыстэмы тэх. адукацыі ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі тэхнічнай рэвалюцыі, за тэхнічную прапаганду ва ўсёй не розкастрынасьці, за ўзбраеньне шырокіх мас „тэхнічнымам".
„ТЕХНИКА"—цісьнейшым чынам зьвязваецца з навукова-дасьледчымі інстытутамі, навукова-тэхнічнымі таварыствамі, рацыяналізатарскімі і вынаходніцкімі, установамі, заводзкімі лябараторыямі і ўсім вытворча-тэхнічным актывам прадпрыемстваў, трэстаў, аб'яднаньняў.
„ТЕХНИКА"—павінна быць частавым дапаможнікам усяго вытворчага актыву, кожнага інжынэра, тэхніка, вынаходніка, гаспадарніка, майстра, прафработніка, партыйца, камсамольца, актывіста, грамадзкага працаўніка.
Газэта будзе выходзіць раз у тры дні.
Падпісная цана—40 к. у мес., у розьніцу—5 к.
Падпісчыкі „ЗА ИНДУСТРИАЛИЗАЦИЮ" атрымліваюць «ТЭХНІКУ» ДАРМОВА да канца году.
Падпіску здавайце пошце. Патрабуйце ва ўсіх кіёсках.
Выд-ва „За индустриализацию"—Москва, Пушечная, 10
Тел. 3-68-47, 5-75-33.

Кошт публікацыі аб згубе дакуманту 1 руб.

29 верасьня, у 19 гадз. у 25 аўд. Камвузу, 2 паверх. (Універсытэцкая, 27) адбудзецца
АГУЛЬНЫ СХОД
Т-ва МАРКСЫСТАЎ ДЗЯРЖАЎНІКАЎ
з удзелам інстытуту Сав. Будаўніцтва і Права БАН.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Даклад аб выніках жнівеньскага пленуму Прайленьня Асацыяцыі т-ва марксыстаў-дзяржаўнікаў (дакл. т. Масвіч).
2. Даклад на тэму „да пытаньня аб масавай рабоце" Гарадзкога Савету (дакл. т. Рудзінскі).
3. Розное.
Прысутнасьць усіх членаў т-ва МД абавязкова. Запрашаюцца савецкі і партыйны актыў; члены Гарсавету, члены дэпутацкіх груп Гарсавету, работнікі сав. устаноў.

БЕЛДЗЯРЖКІНО ПАТРЭБНЫ
на сталую работу ў Менску ў Прайленьні трэсту:
Адзін **старшы бухгальтар**
Адзін **бухгальтар**
Адзін **пом. бухгальтара**
Аплата па згодзе.
Адрас: Савецкая, 90, другі паверх.

УКРАДЗЕНА круглая пячатка Білыніцкага Райспажыўсаюзу, якую лічыць несапраўднай.

МЯНЯЮ кватэру ў Гомелі —з выгодамі на кватэру ў Менску. Даведацца: вул. Карла Маркса, д. 6 кв. 2 —Санцэр, ад 10-11 гадз. раніцы штодзенна да 5-га кастрычніка.

ЗНОЙДЗЕНЫ дакументы на імя Карвігава К. Д.. Зьвярнуцца ў кантору газ. „Зьвязда".

Вячорні Рабочы Універсытэт.
29 верасьня, у 7 гадзін веч., у прадэманстрацыйным корпусе (3-ці паверх)
склікаецца
арганізацыйны сход
нема-паступўных студэнтаў у Менскі вячорні рабочы ўніверсытэт.

УВАГА!
Скора выходзіць з друку першы нумар ілюстраванай навукова-тэхнічнай часопісі ВСНГ і ЦСПСБ
„ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ"
Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" разьлічана на шырокія колы камандзіраў складу прамысловасьці, партыйна-камсамольскага і прафэсійнага актыву, кваліфікаваных рабочых-вынаходцаў, ударнікаў.
Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" ставіць перад сабой задачу ўнядрэньня тэхнікі і сацыялістычнай арганізацыі працы на строга навуковай падставе ў прамысловасьці БССР.
Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" мае аддзелы: 1) Ягулы; 2) Арганізацыя вытворчасьці; 3) Дасягненьні навукі і тэхнікі ў СССР і за мяжой; 4) Абмен вопытам; 5) Кадры і рабсілы; 6) На мясцох; 7) Хроніка; 8) Сярод кнігак; 9) Адказы і кансультацыі.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: на год—3 р., на 6 м-цаў—1 р. 60 к., на 3 м.—85 к. Кошт паасобнага нумару—30 кап.
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, Пляц Волі № 21-1, ВСНГБ, 2-гі паверх, пакой № 6. Тэлефон № 14-33.
За выхадам нумару сачыце у газэтах.
Падпіска прымаецца толькі праз пошту і паштовыя